ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 37-ы
№ 65 (2231)
16 жніўня 1968 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ВАЛАКНІСТЫ, ЗАЛАЦІСТЫ...

Кольні працы, старання, а яшчэ — любасці і замілавання аддаваў селянін лёну! Так было спрадвеку. Пад лён — лепшую латку зямлі, лёну — лішнюю кучку гною, яму ж — лепшую вясеннюю пару. Лянок — гэта і лапаць, і вяроўчына, і пастронак, і пута... Лянок — гэта і вясельная, тонкага нужалю, сарочка, і святочная посцілка-перабіранка, і вышываны дзявочы ручнік... Мусіць, тады, даўным-даўно, і нарадзілася гэтая задушэўная, поўная пяшчоты песня: «Ой, лянок, лянок мой чысты, валакністы, залацісты...».

Адышлі ў нябыт тыя гады, а лён па-ранейшаму ў пашане. «Беларускі шоўк» — называюць яго людзі. Яно і праўда. Тканіны з беларускага лёну здабылі сабе славу ва ўсім, бадай, свеце.

А пачынаецца гэтая слава от тут, на полі.

Зірніце. Наколькі кінуць вокам — залатыя снапы лёну. Ен высах на гарачым ліпеньскім сонцы, галоўні крохкія — дакраніся, і пасыплецца на зямлю семя. Хутчэй у малатарню!

Гэтым цяпер і заняты ільнаводы са звяна Раісы Хвіневіч з калгаса «Звязда», што на Навагрудчыне.

А пасля ільняная саломка ляжа залацістым дываном пад жнівеньскія багатыя росы. Хай вылежваецца, хай даспявае на радасць людзям!

Фота А. ПЕРАХОДА. (БЕЛТА).

НАШ СЦЯГ, НАША НАТХНЕННЕ

Уладзімір Ільіч Ленін. Ленінізм.

З Леніным, з ленінізмам, звязаны ўсе самыя выдатныя рэвалюцыйныя здзяйсненні нашага стагоддзя — Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя, якая азнаменавала пачатак новай эпохі ў гісторыі чалавецтва, утварэнне сусветнай сістэмы сацыялізма, грандыёзныя вызваленчыя бітвы і перамогі, атрыманыя рабочым класам, усімі працоўнымі над капіталізмам. Імя Леніна стала сімвалам пралетарскіх рэвалюцый, сацыялізма і прагрэсу, сімвалам камуністычнага пераўтварэння свету.

22 красавіка 1970 года спаўняецца 100 гадоў з дня нараджэння вялікага правадыра. Да гэтай гадавіны рыхтуецца Камуністычная партыя, савецкі народ, працоўныя ўсіх краін свету.

Днямі апублікавана пастанова Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза «Аб падрыхтоўцы да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна». У ёй яскрава і ўсебакова раскрыта веліч Леніна. Уладзімір Ільіч Ленін увайшоў у гісторыю як геніяльны тэарэтык і практык пралетарскай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва, як стваральнік і кіраўнік бальшавіцкай партыі — авангарду рабочага класа, партыі новага тыпу, як заснавальнік і кіраўнік першай у свеце сацыялістычнай дзяржавы — дзяржавы рабочых і сялян, як прызнаны правадыр сусветнага пралетарыяту, міжнароднага камуністычнага руху, палымяны барацьбіт за свабоду і шчасце працоўных.

Імя Уладзіміра Ільіча Леніна бясконца дорага савецкім людзям, кожнаму працоўнаму чалавеку планеты. Ільіч жыве сярод нас як дарагі друг і таварыш, як мудры бацька, як строгі настаўнік і добры дарадчык.

У пастанове ЦК КПСС вызначана шырокая праграма ідэалагічнай і арганізацыйнай работы партыі, савецкіх і грамадскіх арганізацый і ўстаноў у сувязі з надыходзячым вялікім інтэрнацыянальным святам працоўных. Гэты дакумент мае вялікае значэнне для мабілізацыі мас на новыя поспехі камуністычнага будаўніцтва, выхавання савецкіх людзей у духу ідэйнай перакананасці, непахіснай вернасці ленінізму.

«ЦК КПСС лічыць, — гаворыцца ў пастанове, — што лепшы спосаб адзначыць сотую гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна — гэта сканцэнтраваць увагу на ажыццяўленні грандыёзных планаў гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, якія стаяць перад савецкім народам. Асноўныя намаганні трэба накіраваць на вырашэнне актуальных эканамічных, сацыяльна-палітычных і ідэалагічных задач, пастаўленых у рашэннях XXIII з'езда КПСС».

У свядомай працы, у стваральнай творчасці мас праяўляецца вернасць ленінізму, справе камунізма. Узброены марксісцка-ленінскай тэорыяй, цесна згуртаваны вакол Камуністычнай партыі, савецкі народ упэўнена ідзе наперад ленінскім шляхам, змагаецца за выкананне ленінскіх запаветаў — самааддана працуе над стварэннем камуністычнага грамадства.

Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Савецкага Саюза адзначае, што шырокае разгортванне сацыялістычнага спаборніцтва, паспяховае выкананне пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі—лепшае выражэнне бязмежнай любві да Леніна і актыўнасці мас у барацьбе за здзяйсненне яго запаветаў.

Камунізм, гаварыў Ленін, плён калектыўнай творчасці мас. У шматмільённай арміі будаўнікоў камуністычнага грамадства чуцен і цвёрды поступ атрадаў савецкай творчай інтэлігенцыі, народжанай Вялікім Кастрычнікам.

Будаўніцтва сацыялізма, указваў Уладзімір Ільіч, немагчыма без цэлай гістарычнай паласы ў культурным развіцці мас. Паўвекавы вопыт сацыялізма пацвердзіў правільнасць ленінскай палітыкі партыі ў галіне культурнага будаўніцтва. За гады Савецкай улады ў нашай краіне адбылася велізарная па маштабах і размаху культурная рэвалюцыя. У краіне былі створаны ўсе ўмовы для адукацыі і свядомай стваральнай творчасці рабочых і сялян, для росквіту культуры, навукі і мастацтва ўсіх савецкіх народаў. Натхнёныя ідэямі сацыялістычнай рэвалюцыі, ідэямі Леніна, літаратура і мастацтва сталі саставной часткай агульнапралетарскай справы, усенароднай барацьбы за перамогу камунізма.

Так, росквіт савецкай літаратуры і мастацтва, росквіт сацыялістычнай культуры савецкіх народаў непарыўна звязаны з імем Уладзіміра Ільіча Леніна. Ленінскія прынцыпы сталі тым фундаментам, на якім узрастала, развівалася і мацнела савецкае шматнацыянальнае мастацтва, якое кясе свету высокія ідэалы гуманізму, абуджае ў душах людзей самыя светлыя пачуцці, кранае іх сваёй мастацкай сілай і ідэйнай перакананасцю.

«Нашы рабочыя і сяляне... — гаварыў Ленін, — атрымалі права на сапраўднае вялікае мастацтва». Ен заклікаў работнікаў літаратуры і мастацтва: «Бліжэй да жыцця. Паболей увагі да таго, як рабочая і сялянская маса НА СПРАВЕ будуе нешта СВАЕ ў сваёй будзённай рабоце». Насуперак фарысейскім крыкам буржуазных апалагетаў аб абсалютнай свабодзе творчасці Уладзімір Ільіч у сваёй славутай працы «Партыйная арганізацыя і партыйная літаратура» з камуністычнай прынцыповасцю і адкрытасцю сцвярджаў, што свабода пралетарскага пісьменніка — гэта свядомае падпарадкаванне сваёй дзейнасці барацьбе за свабоду пралетарыяту. Ленін сфармуляваў прынцыпы партыйнасці і народнасці літаратуры і мастацтва сацыялістычнага рэалізму. Партыйнасць і народнасць мастацтва — катэгорыі непадзельныя. Заўсёды партыйнай і народнай будзе творчасць таго мастака, які бачыць жыццё вачыма народа, вачыма лепшых яго сыноў і з высокіх ідэйных пазіцый асэнсоўвае і ацэньвае разнастайныя з'явы рэчаіснасці.

Гэтыя ленінскія запаветы — надзейная зброя савецкіх дзеячоў літаратуры і мастацтва супраць наскокаў нашых ідэалагічных ворагаў. Ленінскія думкі аб мастацтве, аб яго ролі і значэнні ў жыцці народа — гэта шырокая і разам з тым канкрэтная эстэтычная праграма для савецкай творчай інтэлігенцыі.

Як і для ўсіх савецкіх людзей, імя Уладзіміра Ільіча Леніна бясконца дорага дзеячам савецкай літаратуры і мастацтва. Вобраз Леніна — геніяльнага прадаўжальніка вучэння Маркса і Энгельса, заснавальніка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, правадыра найвялікшай сацыяльнай рэвалюцыі і будаўніка першай сацыялістычнай дзяржавы, вобраз Леніна — самага чалавечнага з усіх людзей на зямлі, — для савецкіх пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, работнікаў тэатра і кіно стаў невычэрпнай крыніцай творчага натхнення. Музычная, літаратурная, сцэнічная, скульптурная Ленініяна налічвае сёння сотні і тысячы кніжных тамоў, жывапісных палотнаў, спектакляў, твораў скульптуры. У ёй ёсць і важкі ўклад беларускіх майстроў пяра, пэндзля, разца.

Задачы, пастаўленыя партыяй перад работнікамі савецкай літаратуры і мастацтва, перад дзеячамі культуры па дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, адказныя. Яны да многага абавязваюць савецкіх літаратараў, мастакоў, скульптараў, кампазітараў, дзеячоў кіно і тэатра, работнікаў культурнага фронту.

Партыя заклікае дзеячоў літаратуры і мастацтва стварыць творы, у якіх бы ярка і глыбока раскрываўся неўміручы вобраз Ільіча, яго жыццё і рэвалюцыйная дзейнасць, багацце яго тэарэтычнай спадчыны, барацьба партыі і народа за перамогу ленінскіх, камуністычных ідэалаў.

Шырокі абсяг работы па дастойнай сустрэчы 100-годдзя з дня нараджэння Ільіча вызначае партыя і для работнікаў усяго культурнага фронту — конкурсы-агляды на лепшыя драматычныя і музычныя спектаклі, тэматычныя праграмы канцэртаў, святы мастацтва пад ленінскім дэвізам «Мастацтва — народу», выстаўкі выяўленчага мастацтва, фестывалі мастацкіх і дакументальных фільмаў, прысвечаныя Уладзіміру Ільічу Леніну...

Няма сумнення, што дзеячы літаратуры і мастацтва савецкай краіны горача адгукнуцца на гэты заклік партыі. У адказ на слова роднай партыі савецкія пісьменнікі, мастакі, кампазітары, дзеячы кіно і тэатра, уся творчая інтэлігенцыя Краіны Саветаў заяўляюць, што яны яшчэ вышэй узнімуць сцяг савецкага мастацтва, сцяг яго партыйнасці, народнасці, ідэйнасці, і надалей будуць трымаць у чысціні нашу магутную ідэйную зброю — марксісцка-ленінскую ідэалогію, удасканальваць сваё мастацкае майстэрства, аддаваць усе сілы і здольнасці палітычнаму, маральнаму, эстэтычнаму выхаванню будаўнікоў камунізма, натхнёна працаваць над новымі творамі, ствараць мастацкі летапіс эпохі — эпохі трыумфу высокіх ідэй марксізма-ленінізма.

Гэта будзе іх лепшы падарунак стогадоваму юбілею правадыра.

Дзеячы літаратуры і мастацтва Беларусі, беларускі народ, як і ўсе народы нашай вялікай краіны, сэрцам успрынялі словы роднай Камуністычнай партыі:

— Будзем і далей працаваць і жыць па-ленінску, ствараючы цудоўны помнік Уладзіміру Ільічу — будынак камунізма, вялікае і дастойнае ўвасабленне яго бессмяротных ідэй.

МАЙСТАР ПРЫГАЖОСЦІ

Толькі што майстар узяў у рукі простую, гладкую шкляную вазу. Прыжмурыў вока, прыцэліўся і дакладным рухам нанёс на шкло рыску, потым другую, трэцюю... І тое, што трымаў ён у руках, раптам заіскрылася, зайграла гранямі цудоўнага ўзору. Вось ужо дваццаць гадоў дорыць людзям прыгажосць Віктар Піліпавіч Савельеў. Ен—алмазчык-гравёр, працуе на беларускім шклозаводзе «Нёман», прадукцыя якога славіцца на ўвесь свет.

Фота Э. ТРЫГУБОВІЧА.

СВЯТА ЭСТРАДНАГА МАСТАЦТВА

На вуліцах Мінска паявіліся маляўнічыя афішы: «Фестываль эстраднага мастацтва». Карэспандэнт «Літаратуры і мастацтва» папрасіў намесніка міністра культуры рэспублікі Ю. Міхневіча раскрыць змест гэтых афіш — расказаць пра маючы адбыцца фестываль, пра яго ўдзельнікаў і праграму.

— Відаць, у многіх яшчэ ў памяці, — сказаў намеснік міністра, — апошнія дні мая, калі ў нашай рэспубліцы праходзіў Усесаюзны фестываль опернага і балетнага мастацтва, прысвечаны 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі. Да нас з Масквы, Ленінграда, з саюзных рэспублік прыехалі тады многія вядомыя артысты оперы і балета, каб разам з намі парадавацца нашым поспехам, каб парадаваць нас сваім мастацтвам у знамянальны для нашага народа год. Тысячы людзей у гарадах і вёсках Беларусі пабывалі за час фестывалю на лепшых оперных і балетных спектаклях, на канцэртах з удзелам выдатных майстроў шматнацыянальнага савецкага опернага і балетнага мастацтва. Гэта было яркае і незабыўнае свята. Думаю, што яно засталося не толькі ў нашай памяці, але і ў памяці нашых дарагіх гасцей.

І вось, праз некалькі дзён, да нас прыходзіць другое свята. З 20 жніўня па 1 верасня ў рэспубліцы будзе праходзіць другі фестываль — на гэты раз фестываль эстраднага мастацтва. Ен таксама, як і фестываль опернага і балетнага мастацтва, прысвечаны нашаму вялікаму святу — 50-годдзю БССР і Камуністычнай партыі Беларусі.

У фестывалі прымуць удзел вядомыя ў нашай краіне і за мяжой эстрадныя калектывы і асобныя выканаўцы з многіх саюзных рэспублік. Сваё майстэрства на беларускай сцэне пакажуць Малдаўскі дзяржаўны джаз-аркестр «Букурыя», Дзяржаўны эстрадны аркестр Азербайджана, Рыжскі эстрадны аркестр, эстрадная група Туркменскай дзяржаўнай філармоніі «Прывітанне з Ашхабада», вакальна-эстрадны ансамбль Кіеўскай дзяржаўнай філармоніі «Мрыя», эстрадная група Расканцэрта пры ўдзеле дыпламанткі Усесаюзнага конкурсу эстрады Э. Жэрдзевай, народная артыстка РСФСР К. Шульжэнка, Эстонскі эстрадны ансамбль «Лайне», народны артыст РСФСР і Чэчэна-Інгушскай АССР, лаўрэат міжнародных конкурсаў М. Эсамбаеў, заслужаны артыст Аджарскай АССР, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу вакалістаў Г. Пірцхалава, народны артыст Армянскай ССР А. Акапян, заслужаны артыст Бурат-Мангольскай АССР Б. Бруноў, заслужаная артыстка Грузінскай ССР, лаўрэат Усесаюзнага і Міжнароднага конкурсаў Г. Чахелі.

У фестывалі прымуць удзел калектывы і асобныя выканаўцы і беларускай эстрады, у прыватнасці, эстрадны калектыў пры ўдзеле дыпламанткі Усесаюзнага конкурсу Н. Багуслаўскай, заслужаны артыст БССР, лаўрэат Усесаюзнага і Міжнароднага конкурсаў В. Вуячыч, заслужаны артыст рэспублікі Р. Дзідзенка і іншыя.

Маршруты фестывалю пралягуць па ўсёй рэспубліцы. У многіх гарадах і раёнах Беларусі аматары эстраднага мастацтва будуць мець магчымасць пабываць на фестывальных канцэртах, сустрэцца са сваімі любімымі артыстамі і калектывамі. Напрыклад, на канцэртах джаз-аркестра «Букурыя» змогуць пабываць не толькі мінчане, але і жыхары Гомеля, Рэчыцы, Бабруйска, Пухавіч, Смаргоні, Слуцка, Ліды, Гродна, на канцэртах артыстаў Азербайджана — жыхары Магілёва, Полацка, Віцебска, Оршы, Горак. Рыжскі эстрадны аркестр выступіць у дні фестывалю не толькі ў Мінску, але і ў Гродна, Лідзе, Маладзечне, Барысаве, Мазыры, Рэчыцы, Гомелі, а ансамбль «Мрыя» — у Магілёве, Гомелі, Мазыры, Оршы, Полацку, Віцебску. Выканаўца танцаў народаў свету М. Эсамбаеў пакажа сваё мастацтва ў сталіцы рэспублікі, а таксама ў Брэсце і Баранавічах, ансамбль «Лайне» — у Баранавічах, Кобрыне, Пружанах, Брэсце, Мастах, Лідзе, Гродна.

Старт фестывалю — 20 жніўня ў Мінску. У гэты дзень у канцэртнай зале філармоніі адбудзецца яго адкрыццё і канцэрт з удзелам народнай артысткі РСФСР К. Шульжэнкі, заслужанага артыста Аджарскай АССР Г. Пірцхалавы, народнага артыста Армянскай ССР А. Акапяна, заслужанага артыста Бурат-Мангольскай АССР Б. Брунова, дыпламанткі Усесаюзнага конкурсу Н. Багуслаўскай.

Хочацца пажадаць усім аматарам эстрады яркіх, радасных сустрэч з удзельнікамі фестывалю.

КОЖНАМУ ВЫПУСКНІКУ — ДРУГУЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

КАЛЕГІЯ МІНІСТЭРСТВА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ БССР АБМЯРКОЎВАЕ РАБОТУ ФАКУЛЬТЭТАЎ ГРАМАДСКІХ ПРАФЕСІЙ ВНУ РЭСПУБЛІКІ

...У ВЕСКУ прыязджае малады спецыяліст: настаўнік, урач, інжынер, аграном. Прыезду выпускніка вну рады ўсе. Старшыня калгаса ці дырэктар саўгаса рады новаму чалавеку з вышэйшай адукацыяй. Камсамол, мясцовыя работнікі культуры звязваюць з прыездам адукаванага таварыша свае надзеі: маўляў, малады ўрач ці настаўнік дапаможа ажывіць у вёсцы культмасавую альбо, скажам, спартыўную работу, стане ініцыятарам многіх цікавых пачынанняў у справе ідэйнага і эстэтычнага выхавання вясковай моладзі, з'явіцца праваднікам культуры на вёсцы.

Мінае адзін, два, тры месяцы, праходзіць паўгода, малады спецыяліст паспеў добра-такі абжыцца на новым для сябе месцы, увайшоў у курс тутэйшага жыцця і зусім нядрэнна выконвае даручаную яму работу. Але вось сакратар мясцовай партыйнай арганізацыі папрасіў было маладога настаўніка прачытаць калгаснікам лекцыю аб міжнародным становішчы — той адмовіўся: даруйце, ні разу не даводзілася, гэтаму мяне не вучылі. Загадчык клуба прапанаваў яму арганізаваць работу харавога альбо драматычнага гуртка — малады спецыяліст зноў разводзіць рукамі: які з мяне кіраўнік, дзіваці людзі, думаюць, што ў інстытуце ўсяму вучаць! Вясковыя хлопцы, аматары футбола, звярнуліся з просьбай — быць інструктарам-трэнерам іх калгаснай каманды—малады аграном зноў адмовіўся: выбачайце, нічым памагчы не магу, спортам не займаўся, футболам не цікавіўся і бачыў яго толькі з трыбуны стадыёна...

Так звычайна было некалькі гадоў назад. Надараліся, вядома, прыемныя выключэнні, аднак пераважная большасць маладых спецыялістаў, выпускнікоў вну, прыязджаючы на месца сваёй работы, паводзілі сябе прыкладна так, як расказана вышэй. І вінаваціць іх было ніякавата, бо, сапраўды, ні асновам аратарскага майстэрства, ні таму, каб мець пэўныя веды і навыкі арганізацыі культурнамасавай работы іх, будучых урачоў, інжынераў, настаўнікаў, агранамаў, ветэрынараў, не вучылі.

У апошнія гады становішча змянілася. Цяпер многія выпускнікі вну, поруч з дыпломам аб набыцці той ці іншай спецыяльнасці, атрымліваюць яшчэ і пасведчанні аб тым, што за гады вучобы яны набылі і другую, грамадскую прафесію: хормайстра, кіраўніка танцавальнага калектыву, драматычнага гуртка, аркестра народных альбо духавых інструментаў, лектара-прапагандыста, піянерважатага, кіраўніка фотагуртка альбо аматарскай кінастудыі, дыктара грамадскага радыёвяшчання, кваліфікацыю спартыўнага суддзі ці трэнера і г. д. Усё гэта стала магчыма са стварэннем у вну рэспублікі так званых факультэтаў грамадскіх прафесій. Менавіта тут, на факультэтах грамадскіх прафесій, выпускнікі набываюць гэтыя свае другія спецыяльнасці.

Першыя факультэты грамадскіх прафесій (на грамадскіх, зноў жа, пачатках) узніклі ў вну Беларусі пяць гадоў назад. За гэты час больш чатырох тысяч выпускнікоў універсітэта і інстытутаў набылі тут другія спецыяльнасці. Сваю вытворчую дзейнасць яны ўмела спалучаюць з актыўным удзелам у грамадскай рабоце, арганізацыі лекцыйнай прапаганды ў горадзе і ў вёсцы, стварэнні гурткоў мастацкай самадзейнасці, эстэтычным выхаванні шырокіх мас працоўных.

За гэтыя пяць гадоў накоплены немалы вопыт арганізацыі і правядзення заняткаў на факультэтах. Стала відавочна, што стварэнне ў вну факультэтаў грамадскіх прафесій — справа дзяржаўнай важнасці. Пры належнай пастаноўцы работы факультэты дадуць магчымасць у бліжэйшыя гады папоўніць шэрагі савецкай інтэлігенцыі тысячамі энтузіястаў культмасавай работы, значна палепшыць эстэтычнае выхаванне працоўных, у першую чаргу моладзі.

Акрамя таго, факультэты грамадскіх прафесій ажыўляюць грамадскае жыццё вну, спрыяюць актывізацыі ўсёй выхаваўчай работы сярод студэнтаў, студэнцкай мастацкай самадзейнасці, усебаковаму развіццю будучых маладых спецыялістаў, павышаюць якасць і ўзровень іх прафесіянальнай падрыхтоўкі.

Менавіта таму работа факультэтаў грамадскіх прафесій, далейшае пашырэнне і паляпшэнне іх дзейнасці былі на парадку дня пасяджэння калегіі міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР з удзелам рэктараў і дэканаў факультэтаў вну рэспублікі, прадстаўнікоў партыйных і грамадскіх арганізацый.

На пасяджэнні былі падсумаваны вынікі работы лепшых факультэтаў грамадскіх прафесій. Адзначалася, што найбольш плённа працуе такі факультэт у Беларускім політэхнічным інстытуце. Факультэт грамадскіх прафесій стаў неад'емнай часткай гэтай старэйшай у рэспубліцы тэхнічнай вну. За пяць гадоў у інстытуце падрыхтавана больш пяцісот кіраўнікоў калектываў мастацкай самадзейнасці і розных аматарскіх гурткоў (фота, кіно і г. д.).

На факультэце, з улікам профілю інстытута, адкрыты аддзяленні прамысловай эстэтыкі і патэнтазнаўства. У выніку другая спецыяльнасць, набытая студэнтам на факультэце, дапаўняе першую, асноўную.

За гады вучобы слухачы факультэта зрабілі нямала карысных спраў. Імі створана больш дзесяці навукова-папулярных і кароткаметражных мастацкіх фільмаў, падрыхтаваны цыклы радыё- і тэлеперадач, зроблены фотаздымкі для праспекта інстытута, запісаны на магнітафонную стужку лекцыі выкладчыкаў інстытута і разасланы студэнтам-завочнікам. Слухачы факультэта грамадскіх прафесій арганізавалі работу кінафотагуртка ў адной з мінскіх сярэдніх школ, памаглі набыць грамадскую кваліфікацыю многім актывістам гадзіннікавага і шарыкападшыпнікавага заводаў, дапамагалі маладым рабочым паліграфічнага камбіната імя Я. Коласа аформіць цэхі, абсталяваць рабочыя месцы. Факультэт грамадскіх прафесій БПІ быў удзельнікам Выстаўкі дасягненняў народнай гасладаркі СССР.

Поспех работы факультэта тлумачыцца перш-наперш правільнай арганізацыяй яго дзейнасці, умелым падборам кадраў, увагай і падтрымкай рэктарата, прафкома і камітэта ЛКСМБ. Вучэбная работа тут праводзіцца па цвёрдых планах, якія распрацаваны інстытутам сумесна з зацікаўленымі арганізацыямі і ўстановамі, вучэбны працэс пабудаваны так, як і інстытуцкі, гэта значыць, па курсах.

Станоўчы вопыт работы факультэта грамадскіх прафесій накоплены і ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Усе слухачы факультэта з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі мастацкай самадзейнасці. Студэнты аддзялення суддзяў і інструктараў па спорту прымаюць удзел у судзействе круглагадовай універсіяды, студэнты аддзялення піянерважатых маюць моцныя сувязі з Мінскім Палацам піянераў, а слухачы аддзялення аратарскага майстэрства часта выступаюць з лекцыямі і дакладамі перад працоўнымі па пуцёўках таварыства «Веды».

Пэўнымі поспехамі могуць пахваліцца факультэты грамадскіх прафесій Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, Віцебскага, Гродзенскага і Брэсцкага педагагічных інстытутаў.

На 17 факультэтах усіх вну рэспублікі зараз займаюцца, набываюць другую, грамадскую, прафесію каля шасці тысяч студэнтаў.

За апошнія гады пашырыўся профіль факультэтаў грамадскіх прафесій — цяпер слухачы набываюць тут такія прафесіі, як лектар-прапагандыст, мастак-афарміцель, арганізатар культурнага адпачынку, спартыўны суддзя і трэнер, спецыяліст па прамысловай эстэтыцы і патэнтазнаўстве. Вызначаны цвёрдыя тэрміны навучання. Ад прынцыпаў гуртковай работы факультэты грамадскіх прафесій усё больш пераходзяць да арганізацыі стройнага вучэбнага працэсу. Створаны і працуюць саветы факультэтаў. Для выкладчыцкай работы прыцягваюцца вядомыя дзеячы літаратуры, мастацтва, культуры.

Разам з тым на калегіі адзначаліся і шматлікія праліхі і ўпушчэнні, якія яшчэ назіраюцца ў рабоце факультэтаў грамадскіх прафесій. Галоўны недахоп у тым, што ўзровень работы факультэтаў у большасці вну яшчэ не забяспечвае выпускнікам глыбокіх тэарэтычных ведаў і практычных навыкаў, неабходных для работы па другой, грамадскай прафесіі.

Нягледзячы на тое, што профіль паасобных факультэтаў пашырыўся, усё ж ён па-ранейшаму застаецца вузкаваты. Напрыклад, слухачы не атрымліваюць ведаў па такіх патрэбных спецыяльнасцях, як інструктары па культуры хатняга быту, па ахове прыроды, краязнаўстве і інш.

Не вырашана да канца арганізацыйная структура факультэтаў. У асобных вну яны вельмі малалікія. Так, на факультэце грамадскіх прафесій Мінскага радыётэхнічнага інстытута, які мае тры аддзяленні, займаецца ўсяго 74 студэнты. Многія ж факультэты наогул згарнулі сваю работу. На калегіі адзначалася, што спынілі работу аддзяленні кіраўнікоў эстрадных аркестраў Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, кіраўнікоў аркестраў народных інструментаў тэхналагічнага інстытута, хормайстраў і кіраўнікоў студый выяўленчага мастацтва ў інстытуце народнай гаспадаркі, кіраўнікоў аркестраў духавых інструментаў і танцавальных калектываў у Гомельскім педагагічным інстытуце.

Многія факультэты маюць вельмі слабую матэрыяльную базу: не забяспечаны музычнымі інструментамі і тэатральным рэквізітам, заняткі вымушаны праводзіць там, дзе давядзецца, часам нават на калідорах.

Сям-там на факультэтах адсутнічаюць вучэбныя планы, а калі яны і ёсць, дык нікім не зацверджаныя, па сутнасці, бескантрольныя. У выніку няма сістэмы ў падрыхтоўцы спецыялістаў, пачаткоўцы сядзяць на занятках побач з тымі, што вучацца другі альбо трэці год. Не на ўсіх аддзяленнях наладжана практыка студэнтаў па грамадскіх прафесіях. Недастаткова вывучаецца і абагульняецца вопыт работы лепшых факультэтаў.

Калегія прызнала, што гэтыя недахопы — вынік няўвагі да факультэтаў грамадскіх прафесій з боку рэктаратаў, прафкомаў і камітэтаў камсамола вну, вынік адсутнасці належных клопатаў і падтрымкі. Не спрыяе рабоце факультэтаў і тое, што да гэтага часу няма спецыяльных уніфікаваных падручнікаў, планаў і праграм, што факультэты грамадскіх прафесій, па сутнасці, не ўзаконены ў сістэме нашых вышэйшых навучальных устаноў.

Прынята пастанова аб паляпшэнні работы факультэтаў грамадскіх прафесій. Адобрыўшы дзейнасць лепшых факультэтаў — політэхнічнага інстытута і універсітэта, калегія рэкамендавала ўсім вну вывучыць вопыт іх работы і выкарыстоўваць яго ў практычнай рабоце па падрыхтоўцы сваіх выпускнікоў па другой, грамадскай спецыяльнасці.

Рэктарам, грамадскім арганізацыям вну прапанавана аддаваць больш увагі рабоце факультэтаў грамадскіх прафесій, аказваць ім усялякую падтрымку і дапамогу ў падборы кадраў, у стварэнні моцнай матэрыяльнай базы, узгадняць іх работу з міністэрствам культуры рэспублікі, дамамі народнай творчасці, з іншымі зацікаўленымі арганізацыямі і ўстановамі.

Навукова-метадычны кабінет міністэрства павінен абагульніць вопыт работы лепшых факультэтаў грамадскіх прафесій і выдаць яго асобнай брашурай; сумесна з іншымі ўстановамі і арганізацыямі распрацаваць вучэбныя планы і праграмы для аддзяленняў факультэтаў, якія яшчэ не маюць іх, і уніфікаваць тыя, якія ёсць; стварыць аўтарскія калектывы па распрацоўцы папулярных падручнікаў для слухачоў факультэтаў.

Намечана правесці ў будучым годзе нараду дэканаў факультэтаў грамадскіх прафесій.

ПАКЛОН ПЕСНЯРУ БЕЛАРУСІ

12 ГАДОЎ прайшло ад таго дня, калі спынілася сэрца народнага песняра Беларусі Якуба Коласа. Дванаццаць жніўняў мінула, як беларускі народ у жалобе развітаўся са сваім выдатным сынам.

Але колькі ні пройдзе летаў і зім, колькі разоў ні агорнуцца новай лістотай дрэвы над магілай Коласа, заўсёды дарагім і святым будзе для нашага народа натхнёнае слова песняра роднай зямлі. Яно заўсёды з намі—у будзень і святы, у радасны дзень і ў маркотную хвіліну.

Зноў і зноў выдаюцца коласаўскія кнігі. Жывуць яго цудоўныя творы і мудрыя запаветы, не ціхне гучанне яго голасу ў беларускай літаратуры, не слабне народная памяць аб ім.

Гэты здымак зроблены нашым карэспандэнтам Ул. Крукам 13 жніўня ля магілы Якуба Коласа.

Ускладзены вянкі і кветкі. Хвіліна маўчання. Аддаюць паклон песняру яго паплечнікі і вучні—беларускія пісьменнікі, яго родныя і блізкія, супрацоўнікі музея яго імя, настаўнікі і журналісты, чытачы.

КІНО

ТВОРЧЫ ПАРТРЭТ — НЕ РАЗМАЛЯВАНАЯ АНКЕТА

Перад ім — белы аркуш нотнай паперы. Вось зараз, як птушкі на правадыі, зляцяцца на лінейкі нотныя знакі. І гэта будзе музыкай, якой — хваляваць чалавечыя сэрцы. Уладар гэтай музыкі зусім сівы. Задуменны. Трохі стомлены, як вандроўнік пасля далёкага падарожжа, пуцявіны якога ён сам сабе выбраў. На твары яго прытоена тая дабрыня, якую не перакрэсліць ніякім маршчынам...

Гэта — кадр з фільма-нарыса Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў «Партытура жыцця» — пра Яўгена Карлавіча Цікоцкага. На мяне якраз ён зрабіў самае моцнае ўражанне. Здалося, што я прысутнічаю пры нараджэнні музыкі, чую тую цішыню, якая ў творчым акце бывае падобнай на цішыню перад атакай.

Аператар Віктар Еркін, мне думаецца, старанна папрацаваў над фільмам. Выразнымі атрымаліся ў яго сярэднія планы, калі ён, як кажуць, «жывапісаў» камерай партрэт кампазітара. Не, аператар не ганяўся за эфектнымі кантрастамі святла і ценяў і не шукаў эфектных ракурсаў: галоўнай мэтай для яго, відаць, было перадаць багацце чалавечай індывідуальнасці героя, не засланіць яго прыёмамі, якія толькі дэманструюць «уменне здымаць». У гэтым праявілася яго захапленне Чалавекам і Мастаком, якое перадаецца і нам, гледачам.

«Партытура жыцця» — па форме зусім традыцыйны кінанарыс. Гэта — старонкі творчай біяграфіі кампазітара, якія складаюцца ў партрэт. Так будаваў сцэнарый Ізідор Нісневіч, так вырашаў творчыя задачы рэжысёр Пятро Аліфярэнка.

Ёсць у Яўгена Карлавіча Цікоцкага Сімфанічная паэма «50 гадоў», а сам аўтар распачаў сваю кампазітарскую дзейнасць акурат паўстагоддзя назад — вось кінематаграфісты і скарыстоўваюць гэта. Яны як бы пачынаюць разам з кампазітарам гартаць партытуру Сімфанічнай паэмы, дзе адлюстраваліся і этапы жыцця самога кампазітара. Так быў знойдзены сюжэтны стрыжань стужкі. Адсюль і назва — «Партытура жыцця».

Далей ідуць традыцыйныя сустрэчы героя фільма з пагранічнікамі на Карпатах (бо некалі Цікоцкі падафіцэрам служыў і ваяваў у тамашніх мясцінах) — грыміць горная крыніца, кампазітар углядаецца ў снежную чысціню гор, потым да яго падыходзяць пагранічнікі, якія спяваюць у вольны час песні гэтага музыканта пра службу на дзяржаўных рубяжах... Некалі, у 1918 годзе, першы музычны твор Цікоцкага — музыка да «Песні пра Буравесніка» — выконваўся ўпершыню на былым Абухаўскім заводзе ў Піцеры. І здымачная група едзе ў Ленінград, каб цяпер, праз паўстагоддзя, пабываць там, дзе адбываўся дэбют кампазітара, зняць людзей, якія некалі слухалі «Буравесніка».

Гэта, зразумела, вельмі традыцыйна зроблена. Больш таго, калі глядзіш на экран, часам баішся, што стужка ў наступным эпізодзе пераступіць парог, за якім пануе «яе вялікасць» банальнасць. Бо і здымалася карціна з адкрытай мэтай — праілюстраваць творчы шлях кампазітара. І пра акцёраў, і пра пісьменнікаў, і пра мастакоў наша студыя ўжо многа гадоў запар здымае такія фільмы. Атрымліваюцца сярэднія творы кінадакументальнага жанру, не вышэй. Бо паўтараюцца адны і тыя ж прыёмы. Скажам, калі герой вучыўся ці працаваў некалі з якім-небудзь выдатным дзеячом, на экране абавязкова з'явіцца або гэты дзеяч з успамінамі пра шаноўнага героя стужкі, або адпаведна «выкадраваны» фотаздымак даўніх гадоў. Ну, і абавязкова прагучыць трохі сентыментальная сентэнцыя ў дыктарскім тэксце... І гэта, на жаль, трапіла ў «Партытуру жыцця».

Дык чаму ж тады я напісаў, што пабачыў на экране Чалавека і Мастака? Вось тут і праявілася ўменне рэжысёра П. Аліфярэнкі не толькі стрымліваць сябе на нарозе банальнага, але і прабівацца праз традыцыйную форму да сапраўднага мастацтва.

Па-першае, сам Яўген Карлавіч аказаўся вельмі «кінагенічным», я сказаў бы нават — артыстычным. Фільм здымаўся адкрытай камерай. Але як натуральна выглядае Яўген Карлавіч! І ў сяброўскай гутарцы з маладымі пагранічнікамі, і ў цішыні свайго рабочага кабінета, калі ён нібы прыслухоўваецца да той мелодыі, што вось-вось, здаецца, народзіцца ў сэрцы. Яму верыш і тады, калі ён літаральна разыгрывае гумарыстычную сцэнку з даўнім сваім прыяцелем Уладзімірам Іосіфавічам Уладамірскім, і тады, калі мы бачым яго аднаго ў палоне музычнай стыхіі...

На праглядзе побач са мной нехта не стрымаўся і прамовіў тонам захопленага каментатара: «Чароўны стары!» Не пагадзіцца з такой кароткай, але дакладнай рэцэнзіяй — нельга, бо і сапраўды на экране захавана і выразна перададзена абаяльнасць разумнага і дапытлівага мастака-кампазітара.

Мабыць, таму неўзабаве пасля пачатку фільма забываеш пра даволі банальныя наплывы і «выкадроўкі», прымнасі, даруеш іх аўтарам стужкі, бо аўтары здолелі зрабіць самае галоўнае, — наблізіць да гледачоў арыгінальны характар беларускага музыканта, дапамаглі зазірнуць у вочы, у гэтае «люстра душы», прывабнага і няўрымслівага чалавека.

І — яшчэ: паслухаць яго на дзіва жывую гаворку. Яўген Карлавіч не чытае свой тэкст «за кадрам», ён, здаецца, сам сядзіць недзе ў глядзельнай зале і тлумачыць нам і самому сабе тое, што адбываецца на экране. Часам смуткуе, часам кпіць з самога сябе, жартуе, марыць услых, радуецца з дзіцячай, як кажуць, наівінкай, абдумвае перажытае, запрашаючы і нас, гледачоў, усміхнуцца, калі яму весела, і пасумаваць нейкую мінутку...

І — яшчэ: музыка. Хвалююць унікальныя дакументальныя кадры перададзенай пары, якія захавалі сцэну з оперы «Міхась Падгорны», што была знята ў 1940 годзе на падмостках Вялікага тэатра ў Маскве на дэкадным прадстаўленні з удзелам маладых тады Р. Млодак і М. Лазарава. Або больш даўняя старонка нашай культуры — на экранах краіны дэманструецца стужка фабрыкі Белдзяржкіно «У агні народжаныя» (1930), а кампазітар Цікоцкі стварае клавір музычнага суправаджэння... для тапёраў. Мы бачым і эпізоды з той карціны, і тапёра за раялем. Ды не толькі бачым рэдкія кадры з архіваў, умела ўманціраваныя ў стужку, — слухаем сапраўдную музыку ў цудоўным выкананні і тэхнічна добрым фанаграфічным запісе.

За якіх 18 мінут з экрана гучыць дзесяць музычных нумароў — ад сімфоніі да песень. Зманціравана фанаграма вельмі пісьменна, чыста гучаць Дзяржаўны сімфанічны аркестр УССР пад кіраўніцтвам С. Турчака, усхваляваны голас спявачкі Э. Сучковай, якая кранае сэрца песняй, напісанай Я. Цікоцкім на словы былой ваеннай лётчыцы Марыі Пашкевіч «Памяць пра загінуўшых сяброў», маляўнічы вакальны квартэт Беларускага радыё («Праводзіла мінчанка») і г. д. На пэўны момант гледачоў цалкам захапляе, здаецца, устаўны, «аўтаномны» нумар: спявае Акадэмічная капэла пад кіраўніцтвам Р. Шырмы, і мы зачаравана слухаем апрацоўку народнага хору «Ой, ляцелі гусі...» Экран прымушае нас яшчэ раз і па-новаму адчуць непаўторнае хараство беларускага меласу і чысціню меладычных багаццяў, з якіх так многа пачэрпнуў кампазітар, — стварэцца ўражанне, быццам мы сядзім не ў кіназале, а недзе ля сініх ваколіц Князь-возера...

Дарэчы, таксама «аўтаномна» выглядае і эпізод з лётчыцай М. Пашкевіч. Што ён мае дачыненне да гэтага фільма, сведчыць толькі закадравая (паўтару, цудоўна праспяваная і добра запісаная) песня на музыку Я. Цікоцкага. Ва ўсім астатнім — гэта самастойны сюжэт, які мае выключна ілюстрацыйнае значэнне.

Старонкі біяграфіі перагорнуты. Партрэт кампазітара створаны. Цікоцкі наблізіўся да нас, мы далучыліся да тых жыццёвых крыніц, якія даюць яму натхненне. І ўсё ж пакідаеш залу з супярэчлівым пачуццём. Думаеш: а чаму было б не паспрабаваць аўтарам стужкі адмовіцца ад гэтай формы каталога архіўных кадраў і фотаздымкаў, засцерагчыся ад уплыву энцыкланедыі? Ці не лепш атрымлівалася б, калі б у такіх фільмах-нарысах, дзе ў цэнтры ўвагі кінематаграфістаў творчая асоба, часцей рабіліся рашучыя «прарывы» ў сферу мастацтва? Хай глядач і не даведаецца пра нешта з анкеты героя, затое яму куды цікавей і карысней апынуцца ў свеце фарбаў і колераў, у свеце вершаванага слова або музычнага твора, не толькі паглядзець ці паслухаць, а яшчэ і адчуць філасофскую сутнасць мастацкай творчасці. Анкетна-інфармацыйны падыход да фільмаў, падобных на «Партытуру жыцця», мне здаецца, замінае сапраўдным наватарскім пошукам сцэнарыстаў, рэжысёраў і аператараў. «Усяго» пра чалавека ўсе роўна ж не скажаш за дваццаць (тым больш — за дзесяць) мінут: дык навошта спрабаваць гэта рабіць?

Думаецца, што калектыву беларускіх кінадакументалістаў час звярнуць увагу на агульную тэндэнцыю ў стварэнні біяграфічных фільмаў, бо яна — у адным кроку ад банальнасці.

Барыс БУР'ЯН.

ЗАЎСЁДЫ Ў ПОШУКУ



Калі я завітаў да Уладзіміра Пятровіча Кульваноўскага, вядомага беларускага тэатральнага мастака, ён якраз вярнуўся з летняга падарожжа. Я пацікавіўся, што ён прывёз. Мастак адкрыў эцюднік і пачаў паказваць маляўнічыя пейзажы — беларускія краявіды.

Уладзімір Пятровіч працуе многа. Піша эцюды. Назапашвае ўражанні. Без гэтага тэатральны мастак не зможа добра афарміць спектакль, парадаваць гледача новымі творчымі знаходкамі.

Трыццаць гадоў аддаў Ул. Кульваноўскі тэатру.

У 1938 годзе ён скончыў Віцебскае мастацкае вучылішча. А праз год, прымаючы ўдзел у конкурсе на лепшае афармленне спектакляў, аб'яўленым Беларускім тэатрам оперы і балета, атрымаў трэцюю прэмію за свае эскізы да «Кветкі шчасця».

Яму пашчасціла працаваць з такімі майстрамі сцэны, як Я. Міровіч і К. Галяйзоўскі. Прагна ўбіраў у сябе малады тэатральны мастак кожнае слова выдатнага рэжысёра Я. Міровіча, афармляючы перад Вялікай Айчыннай вайной спектакль «Дзеці Ванюшына», над якім працаваў рэжысёр. З К. Галяйзоўскім ён браў удзел у пастаноўцы асафеўскага балета «Бахчысарайскі фантан».

У гады вайны Ул. Кульваноўскі быў на фронце. Цяжка паранены, доўгі час ляжаў у шпіталі. Атрымаў баявыя ўзнагароды. Потым, калі вайна скончылася, ён зноў бярэцца за сваю любімую справу, працуе ў эксперыментальнай лабараторыі мастацкіх промыслаў і ў сектары этнаграфіі Акадэміі навук БССР. Многа дало яму як мастаку паглыбленне ў народную творчасць. З 1950 года Ул. Кульваноўскі — зноў мастак тэатра оперы і балета.

Рэалістычныя традыцыі тэатральна-дэкаратыўнага жывапісу, якіх трымаўся галоўны мастак тэатра С. Нікалаеў, сталі вядучымі ў творчасці Ул. Кульваноўскага і яго калег па рабоце ў тэатры — М. Юлішча і І. Пешкура. Разам з гэтымі мастакамі Ул. Кульваноўскі прымае ўдзел у стварэнні эскізаў афармлення оперы Я. Цікоцкага «Дзяўчына з Палесся».

Шмат вынаходлівасці праявіў Ул. Кульваноўскі ў афармленні спектакляў для дзяцей. Сярод іх — «Церам-церамок», «Вясна-красна» і інш.

Я ўжо гаварыў у пачатку, што Ул. Кульваноўскі працуе не толькі як тэатральны мастак. Але ён не абмяжоўваецца аднымі толькі акварэльнымі эцюдамі. З'яўляюцца ў яго і станковыя кампазіцыі. Так, праз усю творчасць Ул. Кульваноўскага праходзіць тэма Мінска, яго багатая падзеямі рамантычная гісторыя.

Ул. Кульваноўскаму споўнілася пяцьдзесят гадоў. У яго многа творчых задум. Эцюды, прывезеныя з летніх падарожжаў па рэспубліцы, — этап на шляху іх здзяйснення.

Ул. ЛІСІЦЫН.

НА ВЫСТАЎЦЫ — КВЕТКІ

У Доме культуры Беларускага аўтазавода ў Жодзіна дэманстравалася выстаўка кветак, арганізаваная гарадскім аддзяленнем таварыства аховы прыроды. Экспанавалася многа прыгожых і розных кветак.

Асабліва арыгінальныя былі букеты эксперыментальнай базы «Зарэчча», адзін з іх — «Вечны агонь» з чырвоных, пышных і яркіх вяргінь і «22 чэрвеня 1941 года» — букет з цёмна-аксамітных гладзіолусаў, скабіозы і вяргіні (аўтар Е. Мініна). Увагу наведвальнікаў прыцягнулі букеты «Юрыю Гагарыну», «Лунная саната», і «50 гадоў БССР».

Вялікую і разнастайную калекцыю кветак прадставіла аграном Р. Андруніна (школа-інтэрнат). Прыгожыя гладзіолусы «Раніца нашай Радзімы», «Няхай заўсёды будзе сонца» і «Жарт прыроды» Н. Філіповіч, «Раніца» і «Сяброўна» В. Уласавай.

Вынаходлівасцю і гумарам вылучыліся кампазіцыі з кветак В. Васільева і В. Грановіч «Недатыкі» і «Басаногае маленства».

А. КОРЗУН.

ПАКАЗВАЮЦЬ НАШЫ ГОСЦІ

ВЕСЕЛА, ДАСЦІПНА, ЗМЯСТОЎНА

«Мы хочам танцаваць» — спектакль тэатра аперэты Кузбаса

ПЕРАД пачаткам спектакля «Мы хочам танцаваць» гледачы вельмі ўважліва ўчытваліся ў праграмкі, бо тэатр аперэты Кузбаса ў гэты вечар паказваў твор без той саліднай біяграфіі, калі адна назва збірае поўную залу. Бадай, толькі імя вядомага кампазітара Андрэя Пятрова магло быць рэкамендацыяй. Ды яшчэ тое, што на афішы жанр спектакля вызначаўся не зусім звычайна — «аперэта, дзе многа танцуюць, і балет, дзе многа спяваюць».

Ці спраўдзіліся спадзяванні гледачоў? Зазначу адразу — не было сярод публікі людзей, якія б шкадавалі, што пайшлі на спектакль «Мы хочам танцаваць».

У сваім перадгастрольным інтэрв'ю галоўны рэжысёр тэатра і пастаноўшчык спектакля «Мы хочам танцаваць» Т. Гагава гаварыла, што ў спектаклі акцёры быццам бы іграюць самі сябе: дзеянне адбываецца ў тэатры аперэты...

Гэта, вядома, жарт. Ролі ў спектаклі, праўда, выконваюцца «згодна са штатным раскладам»: балерына іграе балерыну, спявак — спевака. Але ці прапанавалі ў сваёй п'есе Б. Рацар і В. Канстанцінаў акцёрам, каб яны былі на сцэне «самімі сабой» і толькі? Не, п'еса дае тэатру матэрыял змястоўны і цікавы для выяўлення сапраўдных акцёрскіх здольнасцей, а не толькі для «самавыяўлення». За знешнімі эфектамі крыецца вельмі многа небяспечных «падводных рыфаў»: сцэны самыя што ні на ёсць лірычныя знаходзяцца ў цесным суседстве з чыста гратэсковымі; сітуацыі жыццёва праўдзівыя пераплятаюцца з востра сатырычнымі, буфоннымі. П'есу вельмі лёгка сыграць, як «эстрадны агляд», як «капуснік».

У пастаноўцы Т. Гагавы аперэта «Мы хочам танцаваць», — не «эстрадны агляд» і не «капуснік», а вясёлы і адначасова сур'ёзны спектакль.

У жартаўлівым пралогу балетмайстар Ніна Васільеўна (арт. Л. Фралова) растасоўвае дзеючых асоб, нібы шахматныя фігуркі перад пачаткам матча, даючы кожнаму кароткую, але дакладную характарыстыку: вось гэта — таленавітая балерына, а гэта — чароўнае стварэнне, усеагульная любімица; вось гэты — самазадаволены невук; гэты — бюракрат і падліза; а вось — глядзіце — раўнівы муж; а вось — залішне сціплы закаханы... Праз некаторы час і сама Ніна Васільеўна атрымлівае нечаканую, але вельмі эмацыянальную характарыстыку — «грымза» (нішто сабе мянушка для жанчыны!) І вось акрамя гэтай «грымзы», — якая, як потым стане ясна, зусім і не «грымза», а цудоўны, абаяльны чалавек, — усе акцёры іграюць «зададзеныя» ў пачатку характары. А гэта ж нялёгка — апраўдаць аванс, выдадзены на «таленавітую» ці на «ўсеагульную любімицу»!

У маладой актрысы І. Кацелінай хапае і знешняй абаяльнасці, і ўнутранай тактоўнасці, каб сыграць «зорку балета» Наташу дастаткова пераканальна, а Г. Белякова — Оля — вельмі хутка становіцца сапраўднай любімицай глядзельнай залы... Адным словам, усё ідзе так, як нам і паабяцалі, і ўсё ж колькі нечаканага і прывабнага ўнеслі выканаўцы ў свае загадзя дэкларованыя «маскі»!

Вална-Задунайская — гучнае прозвішча вядучай актрысы тэатра аперэты, якая нядаўна адсвяткавала «60 гадоў на сцэне, 50 гадоў прафэсіянага стажу і 40 гадоў з дня нараджэння». Яе велічны поступ, «каралеўскі» погляд, неверагоднае ўбранне Сільвы («Касцюмы ў яе свае, уласныя!» — паведамляе чутным шэптам тэнар Січкін); яе чорныя бліскучыя локаны і чырвоная ружа, якая тырчыць недзе за вухам, — усё гэта смешна само па сабе. Бязлітасна высмейваючы штампы старой аперэты, заслужаная артыстка УзССР Н. Канасевіч сама нідзе не сыходзіць да штампаў, а яны, здаецца, ляжаць на паверхні ролі. Колькі мы бачылі ўжо гэткіх «камедыйных старых», якія прэтэндуюць на ролі маладых гераінь! Н. Канасевіч лёгка абыходзіцца без таннага абыгрывання знешніх рысаў. Яе Вална-Задунайская зацята верыць у свой надзвычайны талент. Яна з такім напружаннем і так сур'ёзна «змагаецца за званне» (маецца на ўвазе званне заслужанай артысткі), што ўшчэнт разбівае рамкі амплуа «камедыйнай старой». Яна такая «цэласная натура», што міжволі выклікае да сябе павагу, — вядома, павагу своеасаблівую, накшталт той, якая чуецца ў воклічы: «Ды ён не проста дурань, а круглы, закончаны дурань!». Вална-Задунайская ў выкананні Н. Канасевіч поўная такой энергіі, такая ваяўнічая і такая нязломная, што перамагчы яе можна толькі самым неверагодным чынам: замкнуць на ключ у дальнім пакоі і не даць выйсці на сцэну. Інакш — вырвецца!..

Чароўны ў ролі Гаўрылы Пятровіча, дырэктара тэатра, народны артыст РСФСР А. Баброў. Спачатку трохі няўдалым здаецца грым Гаўрылы Пятровіча — побач з юнымі, натуральнымі тварамі маладых герояў раптоўна з'яўляецца нейкі цыркавы персанаж, накшталт «рыжага». Але ўсё, што робіць А. Баброў — ходзіць, спявае, размаўляе, прытанцоўвае — усё так трапна, лёгка, прывабна, з такім дакладным адчуваннем жанру, што толькі дзіву даешся, як можна адначасова насіць «маску» і ў той жа час пераканаўча маляваць жывы характар! Гаўрыла Пятровіч раней працаваў у заапарку, але «пагараў» на тым, што зрабіў «дзень адчыненых звяроў...» Цяпер ён успамінае пра заапарк, як пра ціхую гавань: там звяры ўсё ж такі ў клетках, а тут, у тэатры, глядзі, самога з'ядуць... А. Баброў не проста жангліруе смешнымі рэплікамі, — ён іграе сапраўдныя турботы, сапраўдны непакой і амаль святое непаразуменне ўсяго, што адбываецца навокал. Гэта вельмі смешна!

«Мастацкае аблічча» таго тэатра аперэты, пра які расказвае спектакль, раскрываецца толькі праз трох персанажаў: Валну-Задунайскую, Гаўрылу Пятровіча ды яшчэ «героя-палюбоўніка», «вядучага тэнара», нязменнага Эдвіна ў нязменнай «Сільве» — Січкіна. І Валну-Задунайскую і Січкіна мы бачым толькі за кулісамі тэатра, але якая гэта асалода — уявіць сабе, на што яны здатны там, на падмостках! Січкін (артыст Б. Пянькоў) назаўсёды аб'яднаў у сабе малайца Эдвіна і... старшыню мясцкома. «Сільва» ідзе ў тэатры штодзень, нават на дзіцячых ранішніках («у мэтах выхавання эстэтычных густаў падрастаючага пакалення»). Січкіну нават некалі пераапрануцца — уподбег пакідаючы сцэну ў маляўнічай «венгерцы» і высокім ківеры, ён адразу хапаецца за свой мясцкомаўскі партфель. Увесь час ён арганізуе нейкія недарэчныя мерапрыемствы, складае бязглуздыя тэксты адрасоў у гонар тэатральных юбіляраў. («Ты пайшоў ад нас у свой перадапошні шлях», — так звяртаецца ён да артыста, які ідзе на пенсію). Але ў кожны момант свайго закуліснага ліхаманкавага існавання Січкін не забывае, што ён — «герой-любоўнік», «вядучы тэнар» тэатра...

Вельмі прывабны В. Рыцік у ролі Сашы, мужа балерыны Олі, марскога афіцэра. Саша — В. Рыцік на дзіва абаяльна «пакутуе ад рэўнасці», але аддана служыць справе папулярызацыі тэатра, прыводзячы на кожнае прадстаўленне падраздзяленне падначаленых яму матросаў...

Музычны бок спектакля «Мы хочам танцаваць» — на самым высокім узроўні. Нельга нават сказаць, што А. Пятроў напісаў музыку да п'есы. Кампазітар у спектаклі — паўнапраўная дзеючая асоба. Ён як бы адыгрывае ролю нябачнага, але вельмі зацікаўленага вядучага — так тонка і так трапна падкрэслены ў музыцы ўсе сюжэтныя і псіхалагічныя павароты. Бліскуча ідзе, напрыклад, сцэна Олі і Січкіна (арт. Г. Белякова і Б. Пянькоў) — «сцэна спакушэння старшыні мясцкома». Кампазітар, быццам наглядаючы за персанажамі збоку, нечакана прапануе ім гумарыстычна аркестраваны раманс «В крови горит огонь желанья» разам з вядомай фразай з арыі Анегіна... Аркестр (дырыжор — заслужаны дзеяч мастацтва РСФСР Е. Лугаў) гучыць то ўзнёсла і ўсхвалявана (вальс-«успамін», які да таго ж добра спявае Л. Фралова), то лірычна (партыі Наташы і Валодзі), то здзекліва-іранічна (сцэны Гаўрылы Пятровіча), то гарэзліва.

Лібрэта Б. Рацара і В. Канстанцінава — гэта цікавая камедыя становішчаў і характараў. І артысты з добрым адчуваннем жанру іграюць яе. Музыка А. Пятрова напаўняе сцэнічныя падзеі эмацыянальна і інтанацыйна настолькі шчодра, што выканаўцам яна толькі дапамагае глыбей уваходзіць у ролі, натуральна паводзіць сябе ў самых парадаксальных сітуацыях. Так, гэта аперэта, дзе многа танцуюць... Аперэта, дзе забаўна канфліктуюць героі сапраўдныя, сённяшнія, і героі «на час», у якіх няма права быць такімі, а ёсць толькі службовае становішча і амплуа ў тым тэатры, пра які напісалі вясёлы музычны водэвіль яго аўтары.

«Мы хочам танцаваць» — своеасаблівы спектакль яшчэ і таму, што гэта аперэта пра аперэту, дзе парадыйнае часта набліжаецца да сур'ёзнай размовы пра мастацтва і яго работнікаў, а сур'ёзнае пераходзіць зноў у пародыю. І гэтыя пераходы робяцца не толькі адпаведна драматургічнаму матэрыялу, лібрэта, а і дзякуючы актыўна дзейснай музыцы. Танцы і спевы ў такім выпадку — не дадатак да сюжэта, а таксама спружыны сцэнічнага відовішча. Але тэатр заваёўвае поспех пераважна ў галіне спеваў, акцёрскага майстэрства, пантамімы, зладжанасці сцэны з аркестрам. Што ж датычыцца танцаў...

Вось і настае час гаварыць пра адмоўныя бакі пастаноўкі. Яны ёсць, і гэта, на жаль, не проста дробязі. Харэаграфія балетнай часткі відовішча аказалася ніжэй таго, што мы бачылі, скажам, у «Маёй чароўнай лядзі». Глядач прымае многія ўмоўнасці ў спектаклі — напрыклад, арыі Валны-Задунайскай ці «розыгрыш» Січкіна, у выніку якіх ні той, ні другі не могуць удзельнічаць у чарговай «Сільве»... Але мы не можам згадзіцца з тым, што балет, пастаўлены моладдзю таго тэатра, пра які расказвае аперэта, «умоўна» добры, «умоўна» таленавіты. Тое ж, што мы бачым, як кажуць, на свае вочы, не прыносіць лаўраў аніякай балетнай трупе. Відавочна, што кардэбалету кузбаскай трупы трэба ў гэтым спектаклі ўдасканальваць тэхніку. «Кульгае» і пастановачны бок — зусім недакладнай і нават безгустоўнай здаецца сцэна з маленькай дзяўчынкай, якую выносіць на сцэну «фашыст» і якая прарэзліва крычыць: «Мама!..» Гэта, прабачце, «не з той» аперэты. Салістам балета няёмка і цесна танцаваць на тым маленькім «пятачку», які прапануе ім мастак-дэкаратар. Адным словам, у тым, што «яны» хочуць танцаваць, мы пераканаліся бясспрэчна. А вось ці ўмеюць? Сумняваешся... Музыка ж дае вельмі багаты і ўдзячны матэрыял для фантазіі харэографа-пастаноўшчыка!

Спектакль мае поспех. І не будзе, відаць, залішне, калі тэатр, як кажуць, перагледзіць усю яго харэаграфічную палітру.

Інга АЛФІМАВА.

ВЫРАС ПАЛАЦ У БЕЛАЗЁРСКУ...



Малады беларускі горад энергетыкаў Белазёрск на Брэстчыне прыгажэе з кожным годам. Днямі тут гасцінна адчыніў дзверы цудоўны Палац культуры.

Прасторная глядзельная зала на 600 месц, лекцыйная і спартыўная залы, мноства пакояў для гурткоў мастацкай самадзейнасці, памяшканні для дзвюх бібліятэк — для дарослых і дзяцей — чым не цудоўны падарунак белазёрцам напярэдадні юбілею рэспублікі!

На здымку — у фае палаца.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Васіль Макарэвіч
Лясны дарунак

ЛЕТНІМ РАНКАМ, калі так смачна спіцца, да мяне далятаў стук сякеры па нечым пруткім і звонкім, відаць, па бервяне з маладой баравой сасонкі, што гадамі цешылася на сонцы. Ад гэтага стуку раптам заныла сэрца, а на душы стала празрыста і сцішана трывожна, як у дзяцінстве, калі пачуеш першы раз грудны голас зязюлі. Сякера спачатку стукала спакваля, нетаропка; усё роўна як ленавалася, а потым неяк адразу, нібы той танцор, пачала выбіваць чачотку. Падладжваючыся пад яе, ударыла другая сякера, за ёй — трэцяя, чацвёртая... Нельга было разабраць: здалёку ці зблізку далятае перастук сякер. Адно, што выразна адчувалася, дык гэта тое, што там, дзе гупаюць яны, многа святла і прасторы. І ўсё гэта надавала нейкую казачнасць і таямнічасць: і летняй цішыні, і самой раніцы, і нават жыццю.

І неяк у лад гэтай настраёвасці; ціха і асцярожна, нібы баючыся рыпам дзвярэй парушыць мелодыю перастуку, у хату з даёнкай у руках увайшла маці і, убачыўшы, што я павярнуўся тварам у бок перастуку і прыслухоўваюся да яго, таксама неяк ціха і таямніча сказала:

— Грыбаварню на выгане стаўляюць. На тым тыдні прыязджаў з раёна, ну, гэты, самы... як яго... — начальнік грыбавараў і сказаў, каб збівалі дашчанік. Хлопцы і ўхапіліся. Заробак пад бокам.

І я ўспомніў, што ўчора з поўдня на выган вазілі на падводах лес, што там чулася фырканне коней, лясканне сырамятнай пугі, смех і басавітая гамонка мужчын. А пад самы вечар з лесапільні прывезлі свежараспілаваныя дошкі і, калі іх згружалі і складвалі ў штабель, нават адсюль, з вёскі, было чутно, як яны сырыя і пляскатыя, са смачным прыцмокам клаліся адна на адну...

Калі сонца паднялося вышэй, я пералез цераз закладкі, выйшаў на агароды, і маім вачам адкрыўся выган, на якім дужыя постаці ў белых кашулях узмахвалі раз-пораз сякерамі. Павагаўшыся з хвіліну, я развёў убакі высокі карчаваты, увесь у расе бульбоўнік, які даходзіў мне ледзь не да барады і, намацваючы нагамі разору, што ўзялася падсохлай карой прынесенай аднекуль твані, пайшоў уніз, да выгана. Зноў пералез плот, які адгароджвае ад выгана грады, каб у шкоду не ўбілася жывёла, і пад маімі падэшвамі мякка зачаўкала мокрая мурава.

— Го, падмога ідзе, — гукнуў мне насустрач вясковы шпукар і насмешнік дзядзька Болбас, які сядзеў высока над зямлёй на перакладзіне, абхапіўшы яе, нібы таго каня, кароткімі нагамі. На яго твары разлілася хітраватая ўсмешка, з якой ён звычайна пацвельваў якога-небудзь небараку. — Давай памагай! Ды бяры за камель, там больш стрыжня... Гэта ж мы для вас, гарадскіх, стараемся. Каб вы там усю зіму з грыбамі ды варэннем былі. — Дзядзька памыляў губамі і, ледзь стрымліваючы сябе, каб не зарагатаць, працягваў. — Тут, Віця, гэтыя грыбы торк-порк і — гатова. А там (надось прыязджаў з горада мой зяць, дых расказваў) адкупораць бочку — вочарадзь аж на вуліцу з магазіна выпірае. Ад масла і мяса прылаўкі трашчаць і ломяцца, а яны — адно смяхоцце! — за грыбамі ў вочарадзі аж душацца... Грыбоў усе хочуць... Я кажу: а з чаго б гэта так? Што яны ў тых грыбах знайшлі?.. Вітаміны, кажа. Я лепш, кажу скварку ці круг каўбасы з'еў бы, чым той грыб. Гэта таму, што, кажа, вы тут у грыбах летам і зімой днюеце і начуеце. А адно і тое ж прыядаецца. Вось які сказ, брат...

— Ты, Балбас (прозвішча яго знарок перакручваюць, калі хочуць прытушыць дзядзькавы жарты) не выдумляй, што Віця тут... абы як з грыбамі, — заступаецца за грыбара Віктара Нікіпаронка Валодзя Леановіч. — Ты паглядзеў бы, як ён стараецца каля іх. Мые ледзь не ў сямі водах, а кідае туды перац, часнок, укроп — усё, што прывозяць яму з раёна. А то яшчэ з уласнай грады вырве што-небудзь з прыправы ды ўкіне ў кацёл. Робіць так, як для сябе. Хоча, каб грыбы былі смачныя, каб ад міскі і за вушы было не адцягнуць.

Яшчэ колькі год назад грыбы, сырыя і сушаныя, мясцовыя грыбнікі спажывалі і самі. Летам, калі з зямлі, як апантаныя, лезлі сыраежкі і свінні, абабкі і падасінавікі, над усёй вёскай, як воблака, стаяў пах вараных грыбоў. Дзядзька Болбас жартаваў, што ў гэту пару грыбны пах, відаць, чуюць у пасажырскіх самалётах, якія пралятаюць над іх вёскай.

Варылі грыбы не ў печы, і не на камінку — чыгуны выносілі на падворак — памер іх залежаў ад таго, колькі ў хаце душ, — ставілі на трыножнік ці на дзве пакладзеныя рубам цагліны, распальвалі агонь, і чыгун, як усё роўна кантужаны, калаціўся і дрыжаў ад вару, які булькатаў у ім, спрабуючы выскачыць цераз край; і ад яго ішоў гэткі пах, што нават кот выгінаў дугой спіну і, ходзячы вакол яго, вурчаў і смачна аблізваўся. Калі грыбы былі гатовы, чыгун падхоплівалі віламі, неслі ў хату, ставілі на стол, і вялікі драўляны апалонік толькі і ведаў, што хадзіў ад чыгуна і — да міскі...

Белыя грыбы — баравікі — не варылі, а сушылі. Калі выпаліцца ў печы і ў ёй астанецца адзін толькі жар, які свеціцца навылет, гаспадыня разгорне яго качаргой на бакі і пачынае саджаць на гарачы под баравікі, нанізаныя на доўгія, як улезці ў печ, спіцы. Грыбы спачатку звянуць, зморшчацца, а потым ужо возьмуцца сохнуць, і пад вечар іх вымаюць з печы белыя і крохкія, як сухары. Яны пахнуць напаленай цэглай, лясной баравінай і яшчэ нечым такім, ад чаго лёгка кружыцца галава... Пасля іх чапляюць на тоўстыя — з пянькі — ніткі, узносяць на гарышча, падвязваюць да латы, каб іх прадзімаў ветрык аж да самай зімы.

А зімой, калі гаспадар ці гаспадыня едзе ў Мінск да сына або дачкі, прыхопіць з сабой і маткі з баравікамі, прывязе іх на Камароўку і не паспее дайсці да прылаўка, як грыбы раскупяць — расхапаюць з рук, бо як пасля зразумее, такія баравікі бываюць тут гады ў рады, ды і цану не заламаў, як след.

Цяпер усе ядомыя грыбы — свежыя, з кораня, абабраўшы ад лушпіння і сухой іглішы, нясуць у вялізных кашах, а то і вязуць на калёсках да грыбаварні.

(Заканчэнне на 4-й стар.)

ДЗЯРЖАЎНЫЯ ПРЭМІІ БССР

АБМЯРКОЎВАЕМ ВЫЛУЧАНЫЯ ТВОРЫ

РЫСЫ ВЯЛІКАГА ВОБРАЗА

Вялікія заслугі калектыву коласаўцаў у стварэнні тэатральнай Ленініяны. На іх сцэне ўпершыню ў нашай рэспубліцы ў вобразе Ільіча выступаў Павел Малчанаў. Потым—Анатоль Трус. І цяпер—Фёдар Шмакаў.

Спачатку Ф. Шмакаў іграў Валодзю Ульянава ў спектаклі «Сям'я» І. Папова. Пасля—Леніна ў пастаноўцы «Вечная крыніца» Д. Зорына. А летась адбылася новая сустрэча артыста з вобразам Ільіча—у спектаклі «Шостае ліпеня» М. Шатрова.

Пастаноўшчык спектакля «Шостае ліпеня» С. Казіміроўскі, мастак Я. Нікалаеў і выканаўца ролі Леніна артыст Ф. Шмакаў вылучаны на Дзяржаўную прэмію БССР. Кожны з іх заслугоўвае асобнай размовы. Мне тут хочацца пагаварыць толькі аб працы Ф. Шмакава. На маю думку, гэта вельмі значнае дасягненне артыста, хоць ёсць у яго і ўяўныя пралікі.

Натуральнае жаданне кожнага акцёра, які выконвае ролю Ільіча, ва ўсім быць верагодным і дакладным. Але імкненне да поўнай верагоднасці, да абсалютнай дакладнасці для некаторых артыстаў бывае самамэтай. Часам гэта адчувалася і ў рабоце Фёдара Шмакава, асабліва ў першых паказах спектакля. Цяпер, калі акцёр ужыўся ў ролю, ён шчасліва вызваляецца ад «ілюстрацыйнасці», увесь талент скіроўвае на ўнутранае раскрыццё вобраза...

Звернемся да асобных сцэн «Шостага ліпеня».

Падзеі драмы нарастаюць вельмі хутка. Цітры на спецыяльнай заслоне з імклівай рытмічнасцю паведамляюць нам, які час аддзяляе адну падзею ад другой.

Левыя эсэры ад пагроз перайшлі ў адкрытае наступленне. І, каб сарваць брэсцкі мір, піхнуць маладую Савецкую краіну ў бездань вайны, яны ідуць на правакацыі. Забойства нямецкага пасла Мірбаха—адна з іх.

Становішча надзвычай ускладнілася. У гэты трывожны час мы бачым Леніна вельмі сканцэнтраванага, засяроджанага. Ён думае, шукае выйсця. І слухае іншых, выдатна слухае—гэта адна з дарагіх ленінскіх рыс, якую добра даносіць Ф. Шмакаў. Як быць, што рабіць? Тэрмінова ехаць у нямецкае пасольства, растлумачыць, што бальшавікі не маюць ніякага дачынення да забойства, што гэта правакацыя, прасіць прабачэння? Што ж, трэба, дык трэба.

Ленін у нямецкім пасольстве. Трымаецца сціпла і з годнасцю. Як чалавек разумны і інтэлігентны. І разам з тым як дыпламат, палітык. Садзіцца ў крэсла, на нямецкай мове выказвае спачуванне супрацоўнікам пасольства, просіць іх інфармаваць аб гэтым свой урад.

Нельга сказаць, каб такой «місіі» Ільіч узрадаваўся. Але нічога не зробіш—трэба! Людзям патрэбен мір.

А тут яшчэ і новыя выпрабаванні. Эсэры ўзнялі мяцеж, захапілі ўладу ва Усерасійскай Надзвычайнай Камісіі. Арыштавалі Дзяржынскага. І, як пазней выявіцца, падрыхтавалі арышт Леніна. Савецкая ўлада пад пагрозай...

Можна было чакаць ад Уладзіміра Ільіча асаблівай трывогі і неспакою, узрыву яго тэмпераменту. У Ф. Шмакава ж Ленін стрыманы, дзейнічае крыху ў запаволеным рытме, асабліва, калі браць у кантэксце з падзеямі, якія разгортваюцца бурна і імкліва.

У асобных момантах хацелася б большага ўсплёску тэмпераменту, энергіі. Аднак можна згадзіцца і з тым рытмам жыцця вобраза на сцэне, які прапаноўвае артыст. Тым больш, што цяпер, калі спектакль жыве на сцэне не адзін месяц, меншай стала і неадпаведнасць са знешнім малюнкам ролі, рытм унутранага жыцця вобраза Ф. Шмакаў усё больш і глыбей апраўдвае.

Ленін, якім паказвае нам яго артыст, нават у самыя бурныя хвіліны надзвычай засяроджаны. Без аніякай мітусні, нервознасці. Спакой, спакой. Вядома, спакой, які даецца вельмі дарагой цаною, сілай волі, вялікімі намаганнямі. За знешняй стрыманасцю адчуваецца напружаная работа думкі.

Падзеі ўсё больш абвастраюцца, набываючы глыбока драматычны характар. Ленін па-ранейшаму ў Крамлі, які стаў цяпер баявым штабам.

На некалькі хвілін Ільіч выйшаў з рабочага кабінета, прайшоўся па тэрыторыі Крамля. Змрочнае, чорнае неба. Здаецца, зласвесныя хмары апанталі Маскву. Праўда, на двары пакуль яшчэ цішыня. Але цішыня ўяўная, ворагі рэвалюцыі толькі часова замоўклі, стаіліся. Уладзімір Ільіч прайшоўся, спыніўся. Услухаўся ў гэтую трывожную цішыню. Сказаў некалькі слоў. І імкліва пайшоў у свой кабінет.

Зноў складаная, напружаная работа. Кароткія загады, распараджэнні. І пры гэтым ніводнай каманднай інтанацыі. Ні ценю рэзанёрства.

А хмары ўсё згушчаюцца. Ужо адключаны тэлефоны. Пагасла электрычнае святло.

Амаль поўная ізаляцыя.

Кіраваць у такіх умовах стала надзвычай цяжка. Цяпер засталася бадай што адзіная надзея на латышскіх стралкоў. Яны стаяць пад Масквою, і, магчыма, эсэры яшчэ не паспелі заваладаць там ініцыятывай. Зрэшты, хто ведае, некалькі дзён таму назад стралкі былі верныя бальшавікам, Леніну, але ж цяпер падзеі разгортваюцца з такой ліхаманкавай хуткасцю...

Якраз тады, калі яшчэ невядома, хто каго адолее, у Крэмль да Леніна прыходзіць адзін з эсэраўскіх кіраўнікоў. Прыходзіць, зразумеўшы, што з эсэрамі яму не па дарозе, яны—авантурысты. Уладзімір Ільіч застаецца з ім суровым і жорсткім. Па-партыйнаму непахісным. І гэта паказана Ф. Шмакавым не «эпізадычна», а як адна з істотных граняў мастацкага вобраза.

Так, Ленін у Ф. Шмакава—разнастайны і, разам з тым, цэласны характар.

Нягледзячы на вельмі складаную сітуацыю, у Ільіча жыве вялікая нязгасная вера ў перамогу бальшавікоў, адданых салдат рэвалюцыі. Фёдар Шмакаў даносіць да гледачоў ленінскую веру, як своеасаблівую лейттэму вобраза...

Бальшавікі разграмілі эсэраў, падавілі контррэвалюцыйны мяцеж. Зноў загарэлася святло. Запрацаваў тэлефон. Прыступіў да выканання сваіх абавязкаў Фелікс Дзяржынскі. Атрымана вельмі важная перамога.

І Ленін з палёгкай уздыхнуў. Акцёр тут іграе з добрай псіхалагічнай праўдай кожную мінуту. Ленін уздыхнуў так, нібы з плеч скінуты цяжкі груз. І застаўшыся ў кабінеце адзін, адкінуўшы галаву ў крэсле, на некалькі хвілін злёгку задрамаў. І Ф. Шмакаў перадае гэта чалавечна, шчыра, ад сэрца. А мы, гледачы, у хвіліны гэтай цішыні яшчэ больш востра адчулі, як цяжка было Леніну весці гэтую барацьбу.

Апошняя сцэна спектакля—Ленін у Сакольніках. Пасля такога напружання трэба пабыць у цішы, застацца адзін на адзін з прыродай. У думках зазірнуць у заўтра, бо і наперадзе—баі.

На жаль, рэжысёр і мастак, рабоце якіх у гэтым спектаклі ўласціва мужная стрыманасць, фінал спектакля чамусьці трактуюць у сентыментальна-ідылічным плане: маўляў, перамога! І выканаўца галоўнай ролі трапляе ў гэтую танальнасць.

Уражанне ад работы Ф. Шмакава—глыбокае. Тое, што робіць Ф. Шмакаў, значна ўзбагачае беларускую сцэнічную Ленініяну, і прозвішча артыста сярод прэтэндэнтаў на Рэспубліканскую дзяржаўную прэмію зусім не выпадковае.

Анатоль САБАЛЕЎСКІ

ПЕСНЯ ЧАЛАВЕКУ ПРАЦЫ

Георгій Паплаўскі... Наведвальнікам мастацкіх выставак, аматарам беларускай кнігі не так даўно запомнілася гэтае імя. Мастак ён малады. Арыгінальнасць стваранага, творчае гарэнне, няспынныя пошукі новага, таго, што памагае глянуць на прывычнае з нязведанага яшчэ пункту гледжання, — менавіта гэтым перш за ўсё цікавыя работы Георгія Паплаўскага.

Мы з задавальненнем убачылі імя гэтага своеасаблівага майстра ў спісе кандыдатаў на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР 1968 года, за графічную серыю «Здабытчыкі» і ілюстрацыі да паэмы Якуба Коласа «Новая зямля».

Графічная серыя Георгія Паплаўскага «Здабытчыкі»—плён працяглай напружанай работы. У 1965 годзе мастак падарожнічаў на савецкіх рыбалоўных суднах у Атлантычным акіяне. У выніку паездкі з'явілася выстаўка жывапісных і графічных твораў мастака ў верасні—кастрычніку таго ж года. У творах гэтых былі адлюстраваны працоўныя будні рыбакоў, іх мужнасць, воля, стойкасць, у цяжкіх сітуацыях барацьбы са стыхіяй.

Паступова мастак выбраў самае лепшае, што было ў творах аб працы савецкіх здабытчыкаў. І ў 1966—1967 гадах з'явілася цікавая графічная серыя, пра якую мы і вядзем гаворку. У гэтай серыі пяць лінагравюр: «Здабытчыкі», «Аснастка трала», «Агляд трала», «Сярэбраны хек», «Рыбцэх». Самі назвы работ як бы раскрываюць паслядоўнасць працы здабытчыкаў. Скажам адразу, што мастак не вядзе сухі пратакольны пераказ убачанага. Ён стварае рамантычную песню ў гонар савецкага чалавека.

Першая работа серыі — своеасаблівы ўступ, запеўка да астатніх твораў. Перад намі быццам групавы партрэт рыбакоў. Мужныя, манументальныя фігуры. Рыбакі стаяць упэўнена, спакойна. Але пад гэтым знешнім спакоем — колькі энергіі, гатоўнасці да дзеяння.

Лісты «Аснастка трала» і «Агляд трала» расказваюць пра падрыхтоўчыя работы рыбакоў перад ловам. Яны розныя па кампазіцыі — адзін вырашаны ў гарызанталі, другі — у вертыкалі.

У «Аснастцы трала» рытм хвалепадобна схіленых галоў рыбакоў і абрысаў трала падкрэслівае размернасць рухаў людзей, іх згуртаванасць у працы. Добра адчуваецца суровае напружанне твараў рыбакоў.

А ў «Аглядзе трала» вертыкальная кампазіцыя дае магчымасць падкрэсліць значнасць работы людзей. Дасягаецца гэта паказам вялікіх памераў рыбацкага трала, які вісіць, а ўнізе—фігуры людзей. Фігуры гэтыя манументальныя, важкія, сабраныя. Трал не падаўляе іх.

Чацвёрты ліст — «Серабрысты хек», магчыма, крыху дробны. Аднак аўтару ўдалося знайсці добрыя суадносіны чорнага і белага, фігур людзей, трала, рыбы, каб аб'яднаць усё ў адзіны ансамбль, дзе больш кампактныя фігуры людзей выдзелены цёмнымі сілуэтамі. Чалавек у гэтым лісце, больш чым у іншых, паказаны гаспадаром прыроды, які мудра распараджаецца яе дарункамі.

«Рыбцэх» — фінал серыі. І тут фігуры людзей не раствараюцца сярод розных пабудоў. Людзі пануюць у гэтым грандыёзным, прасторным цэху. Фігуры іх паказаны ў фас, у профіль, са спіны, і гэта ўносіць разнастайнасць у адлюстраванае, падкрэслівае адначасова рытмічнасць працы, дзелавітасць, кожны — на сваім месцы.

Для ўсёй серыі характэрна, што чалавек паказаны мужным, стойкім у выкананні свайго працоўнага абавязку ў любых умовах. Можна адзначыць вялікую вобразную выразнасць, канкрэтнасць таго, што адбываецца. У характарах рыбакоў перададзена рамантыка штодзённай нялёгкай працы, якая загартоўвае характар і волю савецкага чалавека.

Гаворачы пра другі твор Георгія Паплаўскага, вылучаны на атрыманне прэміі, трэба падкрэсліць, што мастак — не навічок у галіне афармлення кніг. Больш дзесяці год ён стварае ілюстрацыі да розных твораў беларускай літаратуры. Мастак не толькі ілюструе тэкст, ён стварае паўнакроўныя мастацкія вобразы асноўных герояў таго ці іншага твора, перадае іх у пэўным настроі, адпаведна характару дзеяння, адпаведна часу, адлюстраванаму пісьменнікам. Мастак становіцца як бы сааўтарам кнігі — сродкамі выяўленчага мастацтва дапаўняе тое, што ў творы засталося як бы між радкоў. Ілюстрацыі да коласавай «Новай зямлі», якая выходзіць у выдавецтве «Беларусь» да 50-годдзя БССР,—цікавая работа.

Пачынаючы працу над ілюстрацыямі, малады мастак ведаў, якія цяжкасці стаяць на яго шляху. Ужо ў канцы 40-х гадоў Анатолем Волкавым былі створаны цудоўныя ілюстрацыі да гэтай паэмы.

Георгій Паплаўскі вырашыў цяжкую задачу трохі іншым шляхам, чым яго папярэднік. Асноўнае ў яго ілюстрацыях — псіхалагічная сутнасць лесніка Міхала, яркага прадстаўніка беларускага дарэвалюцыйнага сялянства. Прытрымліваючыся першакрыніцы, мастак адкідае другарадныя дэталі, засяроджвае ўвагу на жыцці і абліччы асноўнага персанажа твора і людзей, якія яго акружаюць.

Ілюстрацыі створаны ў тэхніцы лінагравюры. Цяжка выдзеліць з двух дзесяткаў ілюстрацыі лепшыя і горшыя. Кожная з іх—быццам самастойны твор пра жыццё дарэвалюцыйнага беларускага селяніна, пра яго векавыя мары аб зямлі, аб шчасці, аб хлебе надзённым... Мастак умела перадае знешнюю абстаноўку, у якой адбываецца дзеянне твора, настроі персанажаў, драматызм сітуацый. Праз аблічча героя перададзена жыццё цэлага народа ў пэўны гістарычны перыяд. Менавіта ў гэтым выявілася майстэрства Георгія Паплаўскага, маладога мастака, які вачыма нашага сучасніка перадаў атмасферу далёкай ад нас эпохі.

На маю думку, новыя работы Георгія Паплаўскага, мастака, які настойліва імкнецца да стварэння значных, паўнакроўных мастацкіх вобразаў, вартыя Дзяржаўнай прэміі БССР.

Р. БАРДЗІН,
мастацтвазнаўца.

НОВЫЯ ЭСТАМПЫ БЕЛАРУСКІХ МАСТАКОЎ



Н. ПАПЛАЎСКАЯ. «У лесе». (Лінагравюра).



У. САДЗІН. «У порце». (Лінагравюра).

Л. АСЕЦКІ. «Падпольная «Звязда». (Лінагравюра).

НЕРУШ—ХАРОШАЕ СЛОВА

Звычайна маладыя прыходзяць у літаратуру плеядамі. Пазней пачынаецца дыферэнцыяцыя талентаў і індывідуальнасцей.

Сярод маладых паэтаў, што пачалі ў сярэдзіне 50-х гадоў, Рыгор Барадулін вылучыўся неяк адразу, і аб ім пачалі гаварыць не проста як аб «прадстаўніку пакалення», а як аб паэце арыгінальным і самабытным. Што да зборніка «Неруш», то гэта ўжо добрая сталасць Р. Барадуліна.

У вершах Р. Барадуліна—дыханне сённяшняга дня. Паэт канкрэтна і дакладна перадае думы, пачуцці, настроі нашага сучасніка. Гэта сапраўды маладая, поўная сіл паэзія. Рыгор Барадулін бачыць свет па-свойму, светла і ярка, у многіх і разнастайных яго праявах; ён умее паэтычна разгарнуць кожную з гэтых праяў.

Ну, што б, здавалася, можна сказаць пра дзятлінку, пра тую белую пахучую канюшыну, што расце на ўзлесках, на палянах? А гэта, аказваецца, пляменніца дзятла белагрудага, унучка завеі ўскудлачанай. Да яе, як да дзяўчыны, прылятаюць чмялі-сваты басавітыя, а адвячоркам туман стараецца ўхутаць ёй ногі світкаю. Над ёю, над гэтай дзятлінкаю, праносяцца навальніцы і завеі, а яна жыве, квітнее і раптам паэт знаходзіць ёй такое мастацкае абагульненне, якое ўздымае верш на належную вышыню, асвятляе яго новай паэтычнай думкай:

Дзятлінка снежнарутая,
Як сляза па Радзіме.
чыстая...
Таксама і Беларусь мая
На ўзмежках цвіла
і выстаяла.

Вобраз радзімы ў паэта заўсёды светлы і чысты, нібы гэтая пахучая дзятлінка. Але біяграфія радзімы ведала і шмат драматычнага, невымерна цяжкага, і з пашанай схіляючы галаву перад тым, што было, паэт нясе ў далейшы шлях — свой і радзімы—на кожнай далоні па жаўранку і па хмурынцы на плячах...

Паэта, горача ўлюбёнага ў родную Беларусь, вабіць увесь шырокі прастор Радзімы, і ён бачыць яе ад краю да краю.

На Енісеі ён наведаў перш за ўсё тыя мясціны, дзе быў Ленін у ссылцы. Барадулін вядзе чытача на Усінскі тракт, на Дудзінку, дзе дзяўчына з Гродна падкормлівае чаек, у горную Туву, у госці да новых Адама і Евы, што ўдваіх капаюць бульбу ў далёкай прыморскай тайзе...

А Латвія! Якой жывой і непаўторна прывабнай паўстае перад намі Латвія са старонак «Нерушы»!.. З Латвіяй паэта звязвае і яго ўласная радаслоўная, пра што расказалі шчырыя, з вясёлай іскрынкай, барадулінскія радкі:

Мой дзед
рыжанін Галвіньш,
механік па млынах,
На грошы быў не галы
І выпіць —
не манах.
Яго прываражылі
Азёры ці ільны?
Зрабіўся стражылам
Ушацкай старыны.
Прынамсі,
не малая
Заслуга той,
адной,
Якую зваў
Маланкай
З касою ільняной...

Калі паэзія — мысленне вобразамі, то вершы Барадуліна — адно з лепшых таму сведчанняў. Вобразы ж Барадуліна паўнакроўныя, зямныя — іх адчуваеш ледзь не фізічна: «Шумяць маладою тайгою бароды ў гарнякоў», «на бухматай, як хмара, буслянцы клякоча чырвоная дзюба»; «лісток цялячай мокрай пысцай з даверам торкнуўся ў руку»; «схаваць, як цёплае птушанё, за пазуху роднае слова» і г. д.

У гэтых паэтычных вобразах і асацыяцыях бачыш, адчуваеш і вострую назіральнасць паэта, і юнацкую ўсмешку, а самае галоўнае, сапраўдную цеплыню пачуццяў, якой сагрэта ўсё, пра што б ні пісаў Барадулін.

Не здзіўляешся, калі чытаеш у Барадуліна пра тое, як ён становіцца ў адзін пракос з Паўлюком Трусам:

Як туман на дасвецці,
святлее кашуля—
Здаецца, мурог з
Паўлюком кашу я.
Расхрыстаныя, ступаем
поплавам,
Нам фыркаюць ветры
храпамі цёплымі...

Добра касіць мурог з такім паэтам, як Паўлюк Трус! І верыцца, што Трус не адмовіўся б узяць сабе ў напарнікі такога паэта, як Рыгор Барадулін! Каса ў яго вострая, слова трапнае, а песня звонкая, маладая, напоеная ўсімі сокамі вобразнай, моўнай нерушы.

Рыгор Барадулін памятае—і нанава ажыўляе сваім натхненнем — многія старыя словы. Неруш—адно з іх.

Неруш—харошае слова. Харошая кніга — «Неруш».

Рыгор НЯХАЙ

ШТО ЧЫТАЦЬ ПРА ТВОРЫ, ВЫЛУЧАНЫЯ НА ПРЭМІІ

АЛЯКСЕЙ СЛЕСАРЭНКА. Кніга нарысаў «Дарагія аблічча».
М. Базарэвіч. Памятныя сустрэчы. «Звязда», 16 ліпеня 1967 г.
С. Міско. Незабыўныя сустрэчы. «Мінская праўда», 17 снежня 1967 г.

ЛЕЎ АБЕЛІЁВІЧ. Трэцяя сімфонія.
А. Ладыгіна. Пра час, пра чалавека. «Літаратура і мастацтва», 26 верасня 1967 г.

ЯЎГЕН ЦІКОЦКІ. Опера «Алеся».
Т. Дубкова. Людзям подзвігу прысвячаецца. «Советская Белоруссия», 6 мая 1967 г.
Д. Жураўлёў. Вяртанне «Алесі». «Звязда», 23 красавіка 1967 г.
А. Ладыгіна. Жыві, «Алеся»! «Літаратура і мастацтва», 5 мая 1967 г.
А. Ракава. Сустрэча з «Алесяй». «Мінская праўда», 30 красавіка 1967 г.

СВЕТ, У ЯКІМ МЫ ЖЫВЁМ

Праявы жыцця, адносіны паміж людзьмі, падзеі ў «знешнім» свеце—усё гэта кожны ўспрымае па-свойму, праз прызму асабістага адчування. З той альбо іншай з'явы ці падзеі кожны можа зрабіць свой адпаведны яго характару і разуменню вывад. Часам з'ява, якая ўразіць аднаго чалавека, можа пакінуць абыякавым другога.

І тут мы бываем удзячны пісьменніку, які сваім пільным вокам бачыць тое, міма чаго маглі б прайсці мы, спыняе нашу ўвагу на пэўным факце альбо падзеі, прымушае задумацца над імі. Пісьменнік пашырае тым самым нашы веды аб жыцці, дапамагае глыбей разабрацца ў сутнасці чалавечых характараў, узаемаадносін, лепш пазнаць саміх сябе...

Зборнік апавяданняў Івана Чыгрынава «Самы шчаслівы чалавек» акурат і прываблівае гэтай сваёй паглыбленасцю ў жыццё, адборам фактаў, якія пашыраюць нашы веды аб ім, адкрыццём чалавечых характараў.

Пісьменнік не абмінае складаных паваротаў жыцця, не баіцца ісці ў глыбіні з'яў, дабірацца да іх сутнасці, паказваць чалавека ў пошуках, станаўленні. Ён ніколі не застаецца абыякавым да фактаў і людзей, пра якіх расказвае, расказвае без дыдактызму, але выразна выяўляючы свае адносіны.

Так, мы адчуваем яўную сімпатыю да Ціхаміра, героя апавядання «Чайкі на хвалях», хоць Ціхамір нічога яшчэ і не зрабіў за сваё жыццё—пакуль што ён толькі ў роздуме аб жыцці, шукае ў ім свайго месца.

У апавяданні «Дзічка» мы знаходзім прысуд чалавеку, які ўсё жыццё трымаўся адшчапенцам. Прысуд гэты ў самой недарэчнай смерці Хрупака — апошняга аднаасобніка. Нездарма ў апавяданні з'яўляецца вобраз яблыні, якая здзічэла без догляду. Так і Хрупак, як тая яблыня, што засталася на пакінутым хутары,—здзічэў без людзей. Гэтую думку пісьменнік даводзіць спакваля, не ў лоб, а як бы шкадуючы чалавека за яго неразумнасць, за цёмную ўпартасць.

Такі ж прысуд выносіць аўтар і герою апавядання «Залатая рука» Случанку, які ўсё жыццё спадзяваўся на нейкую ўдачу, на тое, што адшукае залаты клад, цураўся сумленнай працы. Так і прабадзяўся пустацветам па свеце, вярнуўшыся пад старасць у родную вёску чужым і нікому не патрэбным. «Збастоліў чалавек сваё жыццё»,—так гаворыць пра яго аўтар вуснамі свайго другога героя, дзядзькі Хвядоса.

І. Чыгрынаў, аўтар кнігі «Самы шчаслівы чалавек», уважлівы да чалавека, да яго ўнутранага свету. Часта гэты ўнутраны свет чалавека аўтар раскрывае праз штодзённыя, будзённыя клопаты свайго героя.

Ігнат з апавядання «Ішоў на вайну чалавек...» перад адыходам у армію думае аб самых звычайных рэчах, аб тым, чым ён жыў і што рабіў,—аб тым, што не паспеў падважыць хату, не паладзіў жонцы грабель, не падшыў сыну ботаў...

Аўгіння з апавядання «У горад», збіраючыся да нявесткі, таксама думае пра нявыбраныя з поля буракі, пра карову, пра хату...

І праз гэтыя адносіны да сваіх штодзённых абавязкаў пісьменнік раскрывае характары сваіх герояў—добрых, старанных працаўнікоў, сумленных і шчырых людзей, якія больш думаюць пра іншых, чым пра сябе.

Іван Чыгрынаў належыць да таго пакалення, дзяцінства якога было апалена вайною. Натуральна, што тэма вайны займае значнае месца ў яго творчасці, у тым ліку і ў зборніку «Самы шчаслівы чалавек». Праўда, ён глядзіць на падзеі вайны, на факты свайго цяжкога пасляваеннага дзяцінства з адлегласці часу, як бы з нейкай адчужанасцю, тым не менш за тым, што ён расказвае, адчуваецца і вялікі трагізм, і, я б сказала, нейкі своеасаблівы смех праз слёзы.

«За сто кіламетраў на абед...». Ужо сама назва апавядання як бы прыхоўвае лёгкую ўсмешку. З невясёлым гумарам апісвае пісьменнік падарожжа чатырох вясковых хлапчукоў на чале са сваім важаком-дзетдомаўцам. Дзетдомавец вядзе таварышаў у дзіцячы дом— там ён паспрабуе накарміць іх.

Глыбока хвалююць старонкі апавядання «На пыльнай дарозе»: бацька страчае свайго маленькага сына каля спаленай хаты, і малы, як сталы, расказвае бацьку пра галоднае жыццё ў спаленай немцамі вёсцы...

І. Чыгрынаў валодае ўменнем маляваць рэальныя карціны жыцця. Тое, пра што ён расказвае, паўстае перад чытачом ва ўсёй сваёй натуральнасці і непасрэднасці, з усімі фарбамі, пахамі, гукамі.

Сярод кніг, вылучаных на атрыманне Дзяржаўнай прэміі БССР, значыцца і зборнік апавяданняў «Самы шчаслівы чалавек». Лічу, што гэтая кніга заслугоўвае, каб яе адзначылі прэміяй.

Лідзія АРАБЕЙ

«ЖАЛЕЙКА» Ў ЛАНІ

Чэрвеньскім адвячоркам мне давялося быць у вёсцы Лань. З лугу ад рачулкі цягнула свежым пахам падсохлага сена. На вуліцы запаліліся электрычныя ліхтары, ярка засвяціліся і вокны клуба. Спакойная цішыня апала на вёску: ні гуку трактарных матораў, ні сігналаў аўтамашын. У гэтай вячэрняй цішыні пачулася звонкая і чыстая, як вада крыніцы, песня — «Любы зоры залацістыя».

Песня паступова дужэла і мацнела, набіраючыся сілы. А над прасторамі калгасных палеткаў густа высыпалі чэрвеньскія зоры — буйныя і светлыя. І было, мусіць, светла і радасна на душы дзяўчат і жанчын, якія спявалі гэтую цудоўную песню, выказвалі ў ёй сваю прагу да жыцця і працы.

Побач са мной стаяў настаўнік Нясвіжскай школы Сцяпан Паўлавіч Дашко. Ён тут нарадзіўся, тут правёў дзяцінства.

— Не так спявалі раней, — расчулена сказаў ён, прыгадаўшы сваё маленства. — На маіх вачах змянілася жыццё.

Недалёка ад Лані, наводшыбе, расказваў мне Сцяпан Паўлавіч, жыў селянін Іван Сцепановіч. З павагай называлі яго ў вёсцы Янячка. Чалавек ён быў бывалы, добры майстар — рабіў млыны, ставіў дамы. А натуру меў неспакойную. Папрацуе ў адной вёсцы, зробіць добрую справу — і далей, на новыя мясціны. Здаралася быць яму і ў Мінску, і ў Вільні, і ніколі не прыязджаў ён адтуль без кніг. Прыедзе здалёку, сустрэнецца з добрымі знаёмымі і запрашае: «Заходзьце да мяне вечарам, пачытаем новую кнігу». Заходзіў вечарамі да Янячкі і Павел Дашко. Гаспадар, звычайна, дзяружкай завешваў акенца, запальваў газовачку і з нейкай урачыстасцю гаварыў:

— Ну, пачнем...

На гэты раз госць быў здзіўлены навінкай. Янячка дастаў з шуфляды невялікую кнігу, падаў яму.

— Глядзі — на нашай мове... А як праўдзіва!

Гэта была Купалава «Жалейка», год выдання 1908. На вокладцы ў правым кутку было надрукавана: «Загляне сонца і ў наша аконца». У цэнтры — пастушок, вясковы хлапчук грае на жалейцы. Золак, пачынаецца раніца...

Адгорнута першая, другая старонка. Якія свае, кроўныя словы, якія цікавыя і смелыя думкі!

— Дык гэта ж, мусіць, пра мяне напісана!

Я — мужык-беларус,
Пан сахі і касы;
Цёмен сам, белы вус,
Пядзі дзве валасы...

Не мог адарвацца Павел Дашко ад вершаў — такія блізкія яны па думках, па настроі.

З цяжкай працы маёй
Карыстаюцца ўсе,
Толькі мне за яе
Няма дзякуй нідзе...

Узрушаны і радасны, сабраўся Павел Дашко дадому. Янячка на развітанне сказаў:

— Вазьмі кнігу з сабой, дзецям прачытаеш.

А дома, сабраўшы дзятву, чытаў бацька сваім нашчадкам з тае кніжкі. Было ўжо позна, калі ён закончыў чытанне. Але не хацелася спаць ні гаспадыні, ні дзецям — разварэдзіў ён усім душу, зацікавіў.

— З гэтай кніжкай хадзіў мой бацька і на сенакос, і на жніво, — расказваў далей Сцяпан Паўлавіч. — Чытаў там кніжку мужыкам. Але часам было і небяспечна чытаць такія вершы...

У хаце Паўла Дашко часта збіраліся вяскоўцы. Чыталі, спявалі. А песні гаспадар любіў! Бывала, як пачне з сынамі спяваць — хата разлягаецца. Збіраліся па вечарах з аднадумцамі патаемна ў гумне, спявалі там ужо рэвалюцыйныя песні. Не раз чуў ад суседзяў Дашко:

— Даспяваешся... Далёка чуцён твой голас.

Любоў да песні перайшла і да сыноў. І не толькі да песні — да мастацтва. Сцяпан Паўлавіч выкладае маляванне і чарчэнне ў Нясвіжскай СШ № 1, яго часта можна ўбачыць з мальбертам у гарадскім парку, у лесе, над срабрыстай рачулкай. Яго браты Павел, Канстанцін, Лукаш, Васіль жывуць і працуюць у калгасе «Ленінскі шлях». Усе яны на ўсё жыццё пасябравалі з песняй, удзельнічаюць у хоры. Знакамітым на ўсю рэспубліку Ланскім хоры...

...Зборнік Янкі Купалы «Жалейка», большую частку тыражу якога адразу пасля выхаду канфіскавалі царскія ўлады, усё ж такі паспеў часткова разысціся па руках, і як мы бачым, трапіў нават у Лань. Магчыма, што ён трапіў у гэтую вёску і іншым шляхам, не з Мінска. Вядома, што ў 1907—1908 гадах Іван Дамінікавіч працаваў на бровары ў маёнтку памешчыка Гарцінга ў вёсцы Дольны Сноў. Купала, вядома, сябраваў з рабочымі, з сялянамі навакольных вёсак. Магчыма, што пайшла кніга ў народ з яго рук.

Нядаўна зборнік Янкі Купалы «Жалейка» трапіў да мяне — падараваў Сцяпан Паўлавіч Дашко. Янка Брыль, заўважыўшы кнігу ў маёй бібліятэцы параіў:

— Добра, каб гэтую рэліквію перадаць у Дзяржаўную бібліятэку імя У. І. Леніна ў Мінску ці ў Дзяржаўны музей.

Я згадзіўся з ім. Сапраўды ёй месца там.

Паўлюк ПРАНУЗА
г. Нясвіж.

СТРУМЕНІЦЬ ЖЫВАЯ КРЫНІЦА...

НАТАТКІ ФАЛЬКЛАРЫСТА

ЦІ ЁСЦЬ на свеце штонебудзь такое, што кранала б сэрца чалавека больш за матчыну песню, пачутую ў маленстве! З яе, відаць, пачынаецца наша знаёмства са светам. Калі мы, фалькларысты, збіраемся ў чарговае падарожжа, яно для многіх з нас—нібы зварот да матчынай песні.

Адбылося такое падарожжа і сёлета. На гэты раз мы выбраліся на поўдзень Беларусі, на Палессе. Кіраўніком нашай экспедыцыі быў Алег Іванавіч Турышаў — кампазітар, выхаванец кансерваторыі, а зараз навуковы супрацоўнік Акадэміі навук. Усе запісы мы рабілі, у асноўным, на магнітафон. Былі ў нас таксама фотаапараты і кінакамера.

Першая сустрэча з песняй адбылася ў вёсцы Чырвонае Возера (Салігорскі раён Мінскай вобласці), дзе жыве Аўдоцця Міхайлаўна Мацюкевіч. Гэта — невысокая 62-гадовая жанчына з маршчыністым тварам і натруджанымі рукамі. Гледзячы на яе, міжволі ўспамінаеш гімн матчыным рукам, напісаны Максімам Танкам. Некалі яна нямала папрацавала і была, як кажуць, першай спявачкай на сяле.

Спачатку Аўдоцця Міхайлаўна крыху саромелася нас, ніколі ж не спявала «на людзях», але потым захапілася, стала ўспамінаць і спяваць нам усё новыя і новыя песні. І так аж да самае ночы. Мы запісалі шмат старажытных песень у яе выкананні. Аўдоцця Міхайлаўна называла іх «талочнымі», «вясельнымі», «троіцкімі», «купальскімі», «кірмашовымі» і г. д. У гэтай спявачкі свой асабісты стыль выканання. Спявае яна сваім глухаватым голасам павольна, як бы «для сябе». Усе яе песні адрозніваюцца імправізацыйнасцю, нечаканым рытмічным малюнкам.

Частку песень спела нам Аўдоцця Міхайлаўна са сваёй дачкой Верай Васільеўнай Мацюкевіч. Гэта было, у асноўным, унісоннае спяванне з эпізадычным адхіленнем аднаго голасу ад унісона, часцей за ўсё на тэрцыю (з наступным зваротам да унісона) — так званая гетэрафонія.

У вёсцы Чырвонае Возера ёсць яшчэ адна спявачка — Антося Андрэеўна Бердніковіч, якая напела нам таксама шмат песень.

На Палессі вельмі распаўсюджана многагалоснае спяванне ці, як тут кажуць, спяванне «гуртам». Гэта часцей за ўсё двух або трохгалоссе. Выканаўцы дзеляцца на «басуючых», якія вядуць асноўную мелодыю, і на «падводку». Гэтая «падводка» накладваецца на асноўнае гучанне песні.

Адным з першых гуртаў, якія нам давялося пачуць, быў гурт даярак з вёскі Чырвонае Возера. У ім восем вясёлых галасістых жанчын і дзяўчат. Некаторыя з іх хораша «падводзяць», але першымі тут па праву лічаць Людмілу Лагун і Праскоўю Мацкевіч. Гурт выконвае ў асноўным лірычныя песні, часцей за ўсё ў элементарным двухгалоссі.

Сустракалі мы гурты і з іншымі асаблівасцямі.

Значную частку песень запісалі ў вёсцы Пухавічы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Гасцінныя жыхары вёскі дапамаглі нам выбраць лепшых спевакоў. Іх радуе, што народнае спяванне цікавіць не толькі слухачоў, а і навуку.

Па-свойму, арыгінальна спявала тут народныя песні Аксіння Міхайлаўна Купрацэвіч. А спявае яна на свой лад — «гаварком», як бы пераказваючы песню, з своеасаблівым дыялектам. У канцы музычных фраз яна доўга выцягвае апошні гук, заменьваючы галосныя (а-о-е-а), а затым як бы «на выдыху», абрывае яго без дакладна вызначанай вышыні. Найбольш любіць спяваць Аксіння Міхайлаўна старажытныя песні аб нялёгкай жаночай долі. Характэрна, што амаль усе яны маюць невялікі дыяпазон — часцей за ўсё ў межах тэрцыі або кварты, і часта ўвесь напеў будуецца літаральна на некалькіх гуках. Але гэта не збядняе мелодыі.

Палешукі расказвалі нам, што многія з гэтых песень, у прыватнасці, жніўныя, жанчыны і цяпер, бывае, спяваюць. Песні ж аб жаночай долі, сіроцкія, рэкруцкія, батрацкія, прымацкія і г. д. даўно страцілі сваю надзённасць і пяюцца радзей—як успаміны аб мінулым. З абрадавых—найбольш захаваліся вясельныя. Кожная з іх мае сваё прызначэнне. Адну пяюць жаніху, калі выпраўляюць яго ў сваты, другую — маладой, прыбіраючы яе да вянца... І так па песнях можна скласці цудоўнае вакальнае апавяданне пра гэты даўні народны абрад. І калі трапляеш на такое свята, здаецца, што ты аднекуль здалёк вярнуўся ў родны кут, у матчыну хату.

У Пухавічах мы запісалі некалькі гуртаў. Найбольш спадабаўся нам гурт Надзеі Іванаўны Папок. Гэта добра спеты, зладжаны ансамбль (яны пяюць разам каля 20 год), у якім кожная спявачка пільна прыслухоўваецца да іншых. Запявае сваім моцным грудным голасам настаўніца Н. Папок, падводзіць В. Макарэвіч. Песні, якія спявае гурт, у асноўным двухгалосыя з паралельным рухам галасоў, часцей за ўсё тэрцыямі, квартамі або квінтамі. Большасць песень — лірычныя, прасякнутыя светлым роздумам і шчырым пачуццём.

Дарэчы, на Палессі мы яшчэ раз пераканаліся, што на многіх беларускіх песнях і іх выкананні адчуваецца ўплыў украінскага меласу. Гэта надае цікавую своеасаблівасць такім песням, як «Ой, пайду я полем, лугам», «Ой, хмелю, мой хмелю», «І туды гара, і сюды гара». Такі ўплыў — натуральны. У пагранічных абласцях па-суседску абменьваюцца і песнямі.

Вёскай Пухавічы закончылася наша падарожжа па Палессі. Трэба адзначыць, што тут больш распаўсюджана жаночае спяванне, мужчыны ж пяюць значна радзей. Рэпертуар, як я сказала вышэй, складаюць песні самыя разнастайныя — ад старажытных календарных і абрадавых да сучасных. Але ўсе старажытныя песні ў асноўным выконваюць людзі старэйшага пакалення. «Моладзь нашых песень не ведае», — кажуць яны. Ад моладзі мы чулі пераважна толькі частушкі і песні, якія часта выконваюцца па радыё, у кіно.

Бытуе на Палессі дагэтуль і народная інструментальная музыка. Мы запісвалі дудароў, гарманістаў і балалаечнікаў. Сустрэлася нам і некалькі скрыпачоў, але запісалі мы толькі аднаго з іх, бо ў астатніх не было спраўных скрыпак.

— Купілі б новыя, ды няма дзе, — скардзяцца музыканты. — Для работнікаў сельскага гандлю — гэта не хадавы тавар. А шкада!

Сапраўды, шкада. Калі б гэтыя самыя скрыпачы маглі набыць новы інструмент, мы, відаць, пачулі б нямала цікавых твораў. Рэпертуар вясковых інструменталістаў складаюць у асноўным танцавальныя жанры — полькі, вальсы, кракавякі, кадрылі. У вёсцы Восава Салігорскага раёна мы пазнаёміліся з мясцовым дудачнікам Піліпам Трафімавічам Целяком. Ён акрамя танцаў выканаў наступныя нарыгрышы — «Як валоў выганяюць» і «Як валоў прыганяюць». Гэта нешта зусім унікальнае і надзвычай цікавае.

Палессе — самы песенны край на Беларусі. Тут пяюць усе — і старыя, і моладзь, і нават маленькія дзеці. За ўсю нашу нядоўгую паездку мы запісалі каля 150 песень, многія з якіх захапляюць сваім характэрам, меладычным багаццем. Разумеем, што гэта толькі частка тых скарбаў, якія захоўваюцца ў народнай памяці і якія яшчэ павінны быць выяўлены і зроблены набыткам грамадскасці.

І вось цяпер мы зноў марым пра падарожжа па «матчыны песні».

Ала ВАЛАДКОВІЧ.

А гэта некалькі здымкаў, якія мы зрабілі, калі вандравалі па Палессі. Можа, атрымаліся яны і не зусім добрымі—мы ж фотааматары. На першым здымку злева вы бачыце Аксінню Купрацэвіч, яна спявае перад нашым магнітафонам. На другім—Аўдоцця і Вера Мацюкевічы з вёскі Чырвонае Возера. А мужчыны—гэта дудары Піліп Цяляк і яго прыяцель, прозвішча якога я, на жаль, не запісала, бо ён іграў для нас ужо «звыш праграмы»...

Фота аўтара.

Будучаму наведвальніку Наваполацкага музея працоўнай славы будзе што тут паглядзець, чым пацікавіцца. Экспазіцыя музея раскажа пра жыццё маладога, але слаўнага сваімі людзьмі, сваімі працоўнымі і культурнымі справамі горада.

А пакуль што гаспадараць тут мастакі. Аднаго з іх—Віктара Лук'янава фотакарэспандэнт БЕЛТА Р. Усламаў зняў за распрацоўкай эскізаў па афармленні музея.

ПАКАЗВАЮЦЬ НАРОДНЫЯ ЎМЕЛЬЦЫ

На пачатку лета маляўніча афармленыя афішы, расклееныя на будынках шматлікіх сельскіх клубаў і бібліятэк Талачыншчыны, запрашалі народных умельцаў прыняць удзел у фестывалі беларускага мастацтва, прысвечаным 50-годдзю рэспублікі і яе Камуністычнай партыі.

Жыва адгукнуліся на гэты заклік аматары прыкладнога мастацтва. Многія з іх прынялі ўдзел у выстаўках, якія адбыліся ў гарадскім пасёлку Коханава, Слаўнаўскім і Воўкавіцкім сельскіх клубах, вёсках Жукнева, Валосава і іншых. Экспанавалася мастацкае вышыванне і ткацтва, інкрустацыя і інш.

Лепшыя з гэтых работ (а іх каля сямідзесяці) цяпер дэманструюцца на раённай выстаўцы.

Уражваюць работы майстроў мастацкага ткацтва з вёскі Заазер'е Жукнеўскага сельсавета. Усімі колерамі вясёлкі ззяе пакрывала, вышытае калгасніцай А. Урбановіч.

Заатэхнік калгаса імя Куйбашава Ганна Войнічэ экспануе на выстаўцы посцілкі з надзвычай прыгожым нацыянальным арнаментам.

Прыцягваюць увагу наведвальнікаў выстаўкі партрэт Уладзіміра Ільча Леніна, вышыты загадчыцай Воўкавіцкай сельскай бібліятэкі Соф'яй Плаксіцкай, юбілейны пояс з надпісам «50 год БССР і КПБ» — работы майстра Талачынскай тэкстыльнай фабрыкі Ануфрыя Козліка, шкатулка, па-майстэрску зробленая аматарам разьбы і інкрустацыі пастухом Ларыёнам Кавалеўскім, парцьеры, вышытыя пенсіянеркай З. Юрэвіч, карціна «Леснічоўка» настаўніка Коханаўскай сярэдняй школы А. Клімкова і іншыя работы аматараў прыкладнога самадзейнага мастацтва.

Лепшыя работы народных умельцаў Талачыншчыны будуць дэманстравацца на абласной выстаўцы.

Ф. РАМАШОЎ.

Па той бок

КАГО ЎШАНОЎВАЮЦЬ НА РЭЙНЕ

У старажытным замку, размешчаным на адным з астравоў возера Хімзее (Баварыя), у тайне ад грамадскасці адбылося ўручэнне прэміі імя Конрада Адэнаўэра за 1968 год. Прэмію і чэк на 10 тысяч марак кожны атрымалі за «публіцыстычную дзейнасць» Э. Францэль, Ф. Ціс і В. Штэлін.

Што ж прымусіла заснавальнікаў прэміі схавацца ад грамадскасці ў сценах сярэдневякова замка?

Перадгісторыя гэтага такая. Яшчэ ў маі гэтага года мюнхенская арганізацыя «Дойчландштыфтунг» прысудзіла названым «публіцыстам» прэмію імя былога бонскага канцлера. Іх ушанаванне з удзелам баварскай і бонскай эліты, у тым ліку Франца-Йозефа Штрауса, павінна было адбыцца з вялікай помпай у мюнхенскім нацыянальным тэатры. Але выйшла асечка. Узнагароджанне махровых рэакцыянераў і былых гітлераўцаў выклікала шквал абурэння і пратэсту з боку прагрэсіўнай грамадскасці ФРГ.

Гэта прымусіла заснавальнікаў прэміі на час адкласці ўзнагароджанне.

Што ж уяўляюць сабою новаяўленыя лаўрэаты? Эміль Францэль, былы прыхільнік Гэнлейна, з'яўляецца адным з ідэолагаў заходнегерманскага рэваншысцкага «змяляцтва судэцкіх немцаў». У трэцім рэйху ён актыўна супрацоўнічаў у нацысцкім часопісе «Ды цайт». «У 1933 годзе Германія ўступіла ў новы этап сваёй гісторыі»,—з захапленнем пісаў ён пасля прыходу Гітлера да ўлады. Пасля крушэння нацызму фашысцкае нутро Францэля ніколькі не змянілася. Ён не ўтойваў сваёй прыхільнасці да Гітлера, супрацоўнічаў у неафашысцкай газеце «Дойчэ нацыяналь унд зольдатэн-цайтунг», адкрыта заклікаў да тэрору супраць прагрэсіўных сіл ФРГ. Страціўшы ўсялякае пачуццё меры, Францэль пісаў: «Паразітаў можна знішчыць толькі адпаведнымі механічнымі і хімічнымі сродкамі, а не ўгаворваннем». Аналагічных поглядаў прытрымліваецца і другі адэнаўэраўскі лаўрэат—Франк Ціс.

І вось, праз тры месяцы, уручэнне прэмій усё ж адбылося. Толькі не ў мюнхенскім тэатры, а на зацішным востраве. Баючыся новага скандалу, правіцелі Баварыі, у прыватнасці, намеснік прэм'ер-міністра гэтай зямлі Хундхамер, наладзілі ўшанаванне ў вузкім коле. А кіраўнік заходнегерманскіх ультрарэакцыянераў бонскі міністр Штраус, які ў гэты час быў з візітам у ЗША, прыслаў з-за акіяна ў адрас арганізатараў ганебнага спектакля віншавальную тэлеграму, узяўшы іх падахову ад крытыкі заходнегерманскай грамадскасці.

В. СЯРОЎ,
карэспандэнт ТАСС.

КУПІЦЕ АЎТАМАБІЛЬ «ФЮРЭРА»

Мюнхенская фірма «Дойчэр інтэрхандэль» бойка гандлюе аўтамашынамі з былой гітлераўскай імперскай канцылярыі. Нядаўна фірма прадала аўтамабіль, у якім ездзіў «сам фюрэр». За гэтую машыну фірма загнула неймаверную цану: 180 тысяч марак. Паводле думкі мюнхенскіх гандляроў, яна каштавала таго. Бо гэта «гістарычны «Мерседэс», у якім фюрэр ездзіў у апошнія гады перад крахам свайго рэйха. Менавіта ў гэтай машыне Гітлер прымаў парады вермахта.

У сапраўднасці гэтай «рэліквіі» з часоў фашызму можна было не сумняваццa. Фірма мае адпаведныя звесткі былых высокапастаўленых эсэсаўцаў.

Машыну Гітлера набыў адзін амерыканскі багацей, які калекцыяніруе падобныя «сувеніры». Гітлераўскі «Мерседэс» паплыў за акіян. А шкада, вельмі падобныя ўласнікі для яго ёсць і ў самой Заходняй Германіі. Трэба было прыслухацца да парады кёльнскай газеты «Нойе-Рэйнцайтунг», якая прапаноўвала «воінству» з неанацысцкай нацыянал-дэмакратычнай партыі купіць аўтамабіль Гітлера, каб яно «прасоўвалася да мэты, не толькі следуючы запаветам фюрэра, але і ў яго аўтамашыне».

Зрэшты, для неанацыстаў з НДП яшчэ не ўсё страчана. Мюнхенская фірма мае яшчэ адзін «Мерседэс» з аўтапарка імперскай канцылярыі...

В. ВІНАГРАДАЎ,
карэспандэнт ТАСС.

Бонн

Сельскаму гледачу

Пасля гастроляў у Калузе калектыў Магілёўскага драматычнага тэатра ў ліпені і жніўні абслугоўвае хлебаробаў вобласці. Адна брыгада анцёраў з спектаклем «Мурын бор» І. Ісачанкі гастралірує ў Крычаўскім, Касцюковіцкім і Чэрыкаўскім раёнах. Другая творчая брыгада паказвае спектаклі «Жанчына, у якой свае законы» Эдуарда дэ Філіпа і «Жанаты жаніх» А. Кузняцова і Г. Штайна ў Бабруйскім, Клічаўскім, Асіповіцкім і Глускім раёнах.

Усяго за 40 дзён гастроляў сельскаму гледачу паказана 96 спектакляў.

А. КІТАЕЎ,
анцёр Магілёўскага абласнога драматычнага тэатра.

БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ КАНСЕРВАТОРЫЯ імя А. В. ЛУНАЧАРСКАГА аб'яўляе

ДАДАТКОВЫ ПРЫЁМ СТУДЭНТАЎ

на першы курс навучання з адрывам і без адрыву ад вытворчасці (завочнае навучанне) на 1968/69 навучальны год

Прыём праводзіцца на факультэты: ВЫКАНАЎЧЫ па спецыяльнасцях спевы і харавое дырыжыраванне і факультэт КАМПАЗІЦЫІ і МУЗЫКАЗНАЎСТВА па спецыяльнасці музыказнаўства.

Па спецыяльнасцях спевы і музыказнаўства прыём праводзіцца толькі на навучанне з адрывам ад вытворчасці.

У кансерваторыю прымаюцца асобы абодвага полу, якія маюць закончаную сярэднюю адукацыю, якія праявілі творчы талент, актыўна ўдзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці і атрымалі рэкамендацыі з месца работы або вучобы, на навучанне з адрывам ад вытворчасці ва ўзросце да 35 год (па спецыяльнасці спевы — ад 18 да 28 гадоў) і на завочнае навучанне без абмежавання ўзросту, якія паспяхова здалі ўступныя экзамены па наступных прадметах:

СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ,
РУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРЫ (пісьмова і вусна),
ГІСТОРЫІ СССР (вусна).

ЭКЗАМЕН ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ УКЛЮЧАЕ РАЗДЗЕЛЫ:

выкананне сольнай праграмы (для выканаўцаў);
музычная літаратура (для музыказнаўцаў);
сальфеджыо;
гармонія (апрача вакаліста);
элементарная тэорыя музыкі (для вакаліста);
фартэпіяна (для дырыжораў і музыказнаўцаў);
калоквіум.

Заява аб прыёме падаецца на імя рэктара з указаннем абранай спецыяльнасці і формы навучання (дзённае, завочнае).

Да заявы прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (у арыгінале), характарыстыка для паступлення ў ВНУ, аўтабіяграфія, медыцынская даведка (форма № 286), 4 фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору, памерам 3×4).

Пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпісное пасведчанне (асобы прызыўнога ўзросту) прад'яўляюцца асабіста.

Заявы прымаюцца да 7 верасня 1968 г., па адрасу: г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 30.

Уступныя экзамены для паступаючых на навучанне з адрывам ад вытворчасці і без адрыву ад вытворчасці з 9 верасня 1968 г.

ЛЯСНЫ ДАРУНАК

[Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.]

Грыбы прыносяць пад вечар, іх нельга пакінуць, не зварыўшы, назаўтра: папсуюцца, і таму грыбавар Віктар часам круціцца каля катла, пакуль не ўправіцца, усю ноч. І калі хто-небудзь ноччу зірне праз акно на выган, то пабачыць зыркае полымя, што абнімае кацёл з усіх бакоў, і доўгі цень, які ходзіць каля яго, то нагінаючыся, то выпростваючыся. І толькі на досвітку, калі зварыцца апошні кацёл грыбоў і туманы папаўзуць ад рэчкі да агародаў, калі ў вёсцы затрубіць пастух і заспаныя кабеты пачнуць выганяць рахманых кароў, — грыбавар, патушыўшы касцёр, з цяжкай, як ад багуновага дурману, галавой прама праз агароды па роснай сцюдзёнай сцяжыне пойдзе дамоў, каб, прыдрамнуўшы якую гадзіну, зноў усхапіцца на ногі, накляпаць пад паветкай касу і пайсці з ёй на пожню.

Вочы ў яго зліпаюцца, хіліць на сон, але ён перамагае сябе, бо каму-каму, а грыбавару грэх агінацца: грыбавар павінен быць самым цягавітым і дужым у сяле; ды яшчэ ён ведае, што нездарма капціўся каля катла цэлую ноч: нейкая капейчына перападзе.

Харошыя грыбнікі зарабляюць таксама няблага. Каторыя сям'ёй бралі грыбы, то пакуплялі матацыклы, тэлевізары. Цяпер антэн у сяле больш, чым колісь было бусловак.

Вы думаеце, што вельмі проста збіраць грыбы? Ого, гэта цэлая навука. Па-першае, прыкметы. Іх трэба ведаць усе. І што паказвае на грыб, і што не. Калі ноччу і днём, скажам, парна, як у лазні, калі зямля бы пачынае задыхацца ад вільготнай густой духаты, а цёплы туман стаіць не толькі каля ракі, але і ў бары, і ў белым бярэзніку, смела бяры самы вялікі кош — з пустым не вернешся.

У такі дзень наша вясковая суседка Люба яшчэ на світанні падымае з цёплай пасцелі, як тых сонных птушанят, дзяцей і вядзе іх у лес, а ўслед за ёй, як па камандзе, з кашамі ў руках і за плячыма высыпаюць усе вясковыя грыбнікі, і лес напоўніцца шоргатам ног, трэскам сухога ламачча пад нагамі. Грыбы бяруць моўчкі, бо ёсць такая прыкмета, калі грыбнікі будуць моцна гаварыць, то баравікі спалохаюцца і пахаваюцца хто куды: і ў густы верас, і пад шырокі асінавы ліст, і нават за пень.

І яшчэ: у кожнага заядлага грыбніка ёсць сваё даўно аблюбаванае месца, баравіна, куды ён ходзіць адзін і наразае цэлы кош баравікоў. Калі ідуць гурмой, то грыбнік не павядзе ўсіх на сваю баравіну, а скажа: «Адлучуся на хвілінку»,—і знікне ў гушчары. І хаця ўсе здагадваюцца, што ён пайшоў на сваю баравіну, ніхто не пойдзе ўслед—існуе няпісаны лясны закон: сам знайдзі сваю і рэж з яе колькі хочаш.

А праз якую гадзіну грыбнік выходзіць на дарогу з набітым з коптарам кашом баравікоў, зверху ён пакладзе маладзенькія, з чорнымі, як усё роўна лакавымі, шапкамі, каб усе бачылі і хвалілі яго: ого, якіх нарэзаў!..

ЦІХА, па-кацінаму вуркоча матор, свішча вецер у вушах, наўзбоч мільгацяць сосны,—мы з Іванам, сынам Болбаса, едзем у грыбы на матацыкле. Учора яго бацька падбіў нас «скокнуць» за Белы Востраў: там, казаў, кожны год столькі баравікоў, хоць вазамі вазі.

Да Белага Вострава кіламетраў пятнаццаць. Іван, каб заспакоіць мяне, раз-пораз гукае: не паспееш азірнуцца, як там будзем...

Івану трыццаць з хвосцікам, але ён лічыць, што многа пабачыў і перажыў, і яшчэ адносіць сябе да катэгорыі няўдачнікаў, бо няўдала быў ажаніўся, і яму давялося развесціся з жонкай. У вёсцы яго завуць «Разжэнька», — як і ўсіх тут разводнікаў.

— Сапраўды,—расказваў ён,—каб пазнаць чалавека, трэба з ім не адзін пуд солі з'есці. А што? Пабачыў на вечарынцы, тварам упадабалася, згуляў вяселле і прывёз дамоў. Думаў: на руках насіць буду. А яно выйшла, што рукі рад быў агрэсці ад яе. Іншыя жонкі бягуць па ягады, па грыбы, стараюцца—хвіліны не ўседзяць на месцы, а яна ляжыць сабе на ложку ды пасміхаецца: ты мой муж, дык зарабляй і ўпадай за мной. Гляджу: дзе маё і каханне падзелася?.. Ноччу прачнуся, паверыш, душа баліць. Каго, думаю, у жонкі сабе ўзяў? Дармаедку. Спрабаваў з ёй гаварыць—як гарохам аб сцяну. І што ты думаеш? Падагнаў машыну, пагрузіў у кузаў увесь яе пасаг —шкап, пасадзіў самую і адвёз да яе бацькоў: забірайце сваё дабро назад...

Іван збочвае з дарогі і, выкручваючыся паміж соснаў, кіруе да зямлянкі, у якой падсочнікі стаўляюць бочкі са смалой.

— Ты паназірай за ім, Мікола,—просіць ён знаёмага падсочніка,—каб тут які-небудзь штукар...

Мы разуваемся, закасваем вышэй кален штаны і ідзём цераз чыстае, без адзінага кусціка, балота Травяная пасцілка нізка асеўшы пад нагамі, падымаецца ўперадзе і коціцца перад намі высокай зялёнай хваляй.

Вылазім на бераг, праточваемся паміж валежын (Іван кажа, што гэтыя завалы рабілі партызаны на выпадак, калі фашысты будуць наступаць з боку балота) — і, нарэшце, мы на сухім месцы.

— Я пайду сюды,—махае Іван перад сабой рукой, дастае з кішэні нож і зрабіўшы некалькі крокаў, нагінаецца, зразае нешта і кідае ў кош.

Мне карціць спытацца, што ён знайшоў, але я перамагаю цікаўнасць, бяру ўлева, пільна гляджу перад сабой—не дай, божа, прапусціць!—але ўспамінаю наказ дзядзькі Болбаса, што трэба глядзець шырока: справа—налева, вадзіць позіркам туды-сюды так, як касіць касой. Сэрца як усё роўна са сполаху падскоквае, неяк соладка млее, калі я заўважаю баравік. Чарнагаловы, з белай, як сыр, ножкай ён прытуліўся да кусціка верасу і, мне здаецца, цікуе за мной і адначасова засланяецца вешкай верасу, каб я не заўважыў яго. Я станаўлюся на калені і асцярожна зразаю каля самай зямлі і кладу ў кош. І зноў на памяць прыходзіць дзядзькава навука: дзе знойдзеш першы баравік, там шукай і другі. Шугануў позіркам далей, і ў грудзях стала цёпла і прыемна: у якіх пяці кроках стаяў другі, за ім трэці, чацвёрты, а трошкі далей каля валежыны—адразу чатыры ці пяць, павёў вокам управа—тое ж самае. Нават разгубіўся. Якія ж зразаць першнаперш?

Пайшоў прама і натрапіў на абваленую, відаць, з часоў вайны партызанскую зямлянку. Каля ўваходу ў яе—і выбраў жа месца! — нібы вартавы, стаяў баравік—тугі, чарнагаловы, як той грак. Нагнуўся над ім, каб зрэзаць, але перадумаў... Няхай вартуе партызанскую рэліквію...

А калі я з поўным кашом вярнуўся на ўмоўленае месца, Іван ужо чакаў мяне. Апрача тых баравікоў, што былі ў кашы, ён нарэзаў яшчэ поўную сарочку, якую зашпіліў на ўсе гузікі і завязаў матузком каля самага каўнера.

АДВЯЧОРКАМ Віктар Нікіпаронак ужо чакае грыбнікоў каля сваёй грыбаварні. Ён даўно падрыхтаваў вагі і ад няма чаго рабіць перакідвае бліжэй да катла дровы, каб пасля не хадзіць па іх, а седзячы, браць і падкладваць у агонь.

Першым да грыбаварні прыходзіць з невялічкім кошыкам дзядзька Болбас, ставіць яго на вагі і, нібы апраўдваючыся, што грыбоў у яго малавата, абыякава гаворыць:

— Ат, вось ад нечага рабіць, схадзіў на хвіліну ў лес і нарэзаў. Яно, каб паплазаваў з паўдня, то кош прынёс бы. Ды дзе там? Часу вечна ў абрэз... Вунь Люба. Дык яна днюе і начуе ў лесе. Ішоў каля двара—вагон нарэзала... Відаць, на падводзе прывязе...

І сапраўды, неўзабаве вуліцай ідзе з кашом за плячыма Люба, ззаду на крок ад яе такі ж кош нясе яе муж, а следам за імі, як лісічкі за сыраежкамі, трухаюць іх дзеці, два хлапчукі і дзяўчынка. Яны таксама з кошыкамі.

— Дзе ты, Люба, будзеш грошы дзяваць?—пытаецца дзядзька Болбас.—Гэта ж столькі грыбоў, і кожны дзень...

— Або... дзе дзяваць?..—здзіўляецца Люба.—Каб толькі былі, то месца для іх знойдзецца. Во дзеці пойдуць скора ў школу, то іх трэба і адзець і абуць. І чалавек мой хоча матацыкл купіць... Ага, колькі ўсяго трэба купляць і купляць...

— Хто з лесам умее дружыць, у таго і на кніжцы ляжыць,—устаўляе ў гаворку слова грыбавар і ўзважвае грыбы так, каб вагі цягнулі ў яго бок. Ён робіць скідку на кош, на ўсякі пыл ды дым, ад якіх ён адмывае і адмочвае іх у сямі водах, але ніхто з ім за гэта не спрачаецца, кожны ведае: трэба ж і яму нешта мець...

З лёгкай Любінай рукі людзі адзін за адным пасыпалі да грыбаварні, загулі, загаманілі, як пчолы каля вулея. Віктар прымае грыбы і раз-пораз пазірае то на гадзіннік, то на кацёл, што як тая квактуха, трасецца і квокча над агнём; нарэшце хапае вялізны апалонік, пачынае чэрпаць з катла звараныя грыбы і выліваць у загадзя вымытую і высушаную на сонцы бочку. Над катлом і бочкай вісіць па добрай шапцы калматай пары, якая смачна пахне рознымі прыправамі.

Вычарпаўшы з катла грыбы, Віктар перакульвае ў яго некалькі вядзёр вады, пакуль яна закіпіць, хапае круглае дно, што стаіць прыслоненае да бочкі, устаўляе яго ў пазы і важкім малатком набівае на бочку абручы. Пасля лёгка куляе яе на бок і коціць пад паветку, каб яна не рассыпалася на сонцы і не набрыняла на дажджы. Пры гэтым ён паспявае прыкінуць на вока, што бочак набралася больш двух дзесяткаў і што пара ўжо іх адпраўляць на станцыю.

К гэтаму часу ў катле сярэдзіта закіпае вада, Віктар бярэ вядро з вымытымі грыбамі, высыпае ў кіпяцень, і ў катле пачынае булькаць і хадзіць усё ходырам, ды так, што здаецца, вось-вось кацёл сарвецца з дратоў, якія падвешаны да слупоў, і грымнецца вобзем.

А жанчыны ўсё нясуць і нясуць у кошыках чыстыя крамяныя грыбы—дарунак шчодрага лета.

А назаўтра зноў устануць рана і пашыбуюць нацянькі ў звонкі стогадовы бор, каб зноў нагінацца за баравікамі, як усё роўна кланяцца зямлі за яе багацце, якое дорыць людзям.

Крупскі раён,
вёска Купленка.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ:

г. Мінск, вул. Захарова, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела тэатра, кіно і музыкі — 3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва архітэктуры і вытворчай эстэтыкі — 3-24-62, аддзела публіцыстыкі — 3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 6-25-19, бухгалтэрыі — 6-25-87.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Друкарня выдавецтва «Звязда».
Індэкс 63856. АТ 01877.